

ЧЫМ УРАЖВАЕ ШАС

4

ШТО ПРАПАНОЎВАЮЦЬ ЮНЫЯ ВЫНАХОДНІКІ



ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 ЛІПЕНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 143 (30277)

## КОРАТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 24 ліпеня правёў тэлефонную размову з Прэзідэнтам Узбекістана Шаўкатам Мірзіёевым.**
- Намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў чэрвені склала Br2270.
- **Дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў павялічваюцца з 1 жніўня.**
- Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы 26 ліпеня завершыць 104-ы сезон паказам легендарнага спектакля «Паўлінка», якому сёлета споўнілася 80 гадоў.
- **Новы рэзідэнт СЭЗ «Мінск» зоймецца арганізацыяй вытворчасці ювелірных вырабаў.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей БАГДАНАЎ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«Інфляцыя не павінна быць нулявой. Мы ж бачым, як растуць зарплаты, выплаты, пенсіі. Таму, вядома, і цэны на тавары могуць расці, гэта абсалютна нармальна. Але ненармальна, калі яны растуць занадта хутка і непадкантрольна. Таму задачы ў тым, каб забяспечыць кіраваную інфляцыю ў адпаведнасці з зададзенымі параметрамі. Мы жорстка адсочваем гэтыя лічбы і рэагуем, калі нешта атрымліваецца не так».*

ISSN 1990 — 763X

З першых вуснаў

# «КОЖНЫ КАВАЛАЧАК ТУТ ПАВІНЕН БЫЦЬ АПРАЦАВАНЫ»

## Як прайшла інспекцыя ўборачнай кампаніі ў Мінскім раёне

**Жніво ў разгары і пад пільнай увагай Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. На мінулым тыдні падчас селектарнай нарады, прысвечанай уборачнай кампаніі, кіраўнік дзяржавы выказаў галоўныя заўвагі і акрэсліў ключавыя задачы на гэты найважнейшы этап сельскагаспадарчага сезона. Аднак найбольш поўную карціну ўборачнай можна ўбачыць толькі на месцах. Таму Прэзідэнт пачаў інспекцыю ўборачнай кампаніі ў рэгіёнах. Першым стаў Мінскі раён — Аляксандр Лукашэнка наведаў сельгаспрадпрыемства «Усход», размешчанае ў прыгарадзе сталіцы.**



Фота БелТА.

У полі зроку кіраўніка дзяржавы апынуліся і іншыя мясціны: на верталёце ён абляцеў амаль увесь Мінскі раён і ўбачаным застаўся незадаволены. «У яго палі не пераараны. У Ждановічах, пасёлках па два-тры-пяць гектараў наогул закінутыя землі. І гэта пад Мінскам. Страшэннае ўражанне. Я не скажу, што катастрофа. Але гэта не Мінскага раёна землі (размова аб патрэбным узроўні гаспадарання. — **«Зв.»**). Дрэнна», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка параіў аграрыям падчас сёлетняй уборачнай кампаніі рабіць акцэнт не столькі на стратэгію, колькі на тактыку. Надвор'е патрабуе. «Трэба паглядзець з тактыкай, цяпер ужо не па стратэгіі пытанне. Да нас набліжаецца значны фронт», — заўважыў беларускі лідар. Па яго словах, трэба вызначыцца, на што ў першую чаргу трэба кінуць асноўныя сілы, каб мінімізаваць страты ці ўвогуле не дапусціць іх. Прэзідэнт заўважыў, што пасля нядаўняга ўрагану на палях ёсць шмат участкаў з палеглымі каласавымі. Іх трэба як мага хутчэй сабраць, бо калі зноў пойдуць дажджы, ураджай там канчаткова прападзе. Разам з тым, убіраючы палегліцу, у выпадку чарговай непагадзі важна не страціць ураджай з добрых палёў.

З улікам усіх акалічнасцяў прымаць аператыўныя рашэнні — такая парада ад Прэзідэнта. «Усё паспела аднačасова. І рапс яшчэ не ўбралі», — сказаў ён аб напружаным графіку работ.

### «ДЫКТАТУРА ТЭХНАЛОГІЙ ЗАБЯСПЕЧВАЕ ВЫНІК»

Прэзідэнту паказалі рапсавае поле, на якім спецыялісты гаспадаркі «Усход» прыкладаюць шмат намаганняў. І яны апраўдваюцца. «Я такога рапсу не бачыў, шчыра кажучы: лес», — адзначыў Прэзідэнт. Ён падрабязна пацікавіўся, як дасягнуць такога выніку, якія тэхналогіі прымяняюцца, наколькі эфектыўныя ўгнаенні. На пытанні Прэзідэнта адказваў спецыяліст, які непасрэдна займаецца рапсам і іншымі культурамі ва «Усходзе», — галоўны аграном Ігар Пратасеня. «Галоўнае — любіць сваю працу і строга выконваць тэхналогіі апрацоўкі. Дыктатура тэхналогій забяспечвае вынік. Гэты рапс выгадавалі і вырашчаны дзякуючы намаганням усіх спецыялістаў, не толькі агранамічнай службы. Для такога выніку важна ўсё — пачынаючы ад навукі і тэхналогій. У нас уся тэхніка, занятая на вырошчванні рапсу, — айчыннай вытворчасці, своечасова ўносім мінеральныя ўгнаенні, якія выпускаюць нашы беларускія заводы. Вынік — гэта захаванне норм высеву, вывучэнне сартоў і гібрыдаў рапсу, пастаяннае самаўдасканаленне», — расказаў потым журналістам Ігар Пратасеня. Прынамсі, і Прэзідэнт высока ацаніў такі падыход да працы.

СТАР. 2

Жніво-2024

# Першыя — найлепшыя!



**На гэтым тыдні Віцебшчына ўвайшла ў актыўную фазу ўборкі па ўсіх культурах. У агульную скарбонку краіны паўночны рэгіён ужо паклаў больш як 200 тысяч тон збожжа з улікам рапсу. У гарачыя дні ўборачнай кампаніі ў рэгіёне вызначыліся першыя перадавікі, на якіх раўняюцца і астатнія працаўнікі хлебнай нівы.**

СТАР. 3

Год якасці

# ТОЕ, ШТО ВЫРАСЦІЛІ САМІ

## За шэсць месяцаў гэтага года нарыхтоўшчыкі Белкаапсаюза выплацілі насельніцтву 146 мільёнаў рублёў

**За першае паўгоддзе 2024 года тэмп росту закупак у насельніцтва прадукцыі раслінаводства да аналагічнага перыяду 2023 года склаў 131 %. Усяго за апошнія шэсць месяцаў арганізацыямі Белкаапсаюза нарыхтавана сельгаспрадукцыі і сыравіны на суму 237 мільёнаў рублёў. Прычым больш за 62 % гэтай прадукцыі закуплена ў насельніцтва, якому выплачана 146 мільёнаў рублёў. Пра гэта расказала начальнік упраўлення нарыхтовак і знешнеэканамічнай дзейнасці Белкаапсаюза Аксана СКІНДЭР.**



СТАР. 5

# «КОЖНЫ КАВАЛАЧАК ТУТ ПАВІНЕН БЫЦЬ АПРАЦАВАНЫ»



*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандру Лукашэнку падрабязна расказалі пра дзейнасць «Усхода». Гэта шматгаліновая гаспадарка, якая спецыялізуецца на вытворчасці малака, мяса буйной рагатай жывёлы, кармоў, вырошчванні бульбы, збожжавых, рапсу, кукурузы, прадукцыі садаводства, сыроў. Таму сапраўды паглядзець ёсць што.

Маршрут кіраўнік дзяржавы абраў сам, не той, які быў запланаваны. Пасля рапсавага поля Аляксандр Лукашэнка агледзеў мехдвор гаспадаркі, прыехаў на збожжаток прадпрыемства. Прыезд Прэзідэнта ход звычайнага рабочага дня супрацоўнікаў не парушыў, хіба што на некалькі хвілін яны адарваліся ад працы, каб адказаць на пытанні кіраўніка дзяржавы.



Паглядзеў Аляксандр Лукашэнка і на жывёлагадоўчы комплекс прадпрыемства. Нягледзячы на тое, што ўдоі тут прыстойныя — гадавы ўдой ад каровы каля 9,4 тысячы кілаграмаў малака, паляпшаць умовы ўтрымання жывёлы неабходна, комплекс не адпавядае сучасным патрабаванням. Гэтае пытанне ўжо адпрацоўваецца. Цяпер разглядаюцца два варыянты: рэканструкцыя комплексу ці перанос яго ў іншае месца. Другі варыянт ускладняецца тым, што комплекс знаходзіцца ў межах населенага пункта і санітарныя нормы не дазваляюць разгарнуцца, а забяспечыць «жылой плошчай» трэба нямала галоў. «Трэба будаваць сучасны комплекс. Трэба кудысьці выносіць», — заўважыў Прэзідэнт.

«Ніжэй сярэдняга» — такую адзнаку кіраўнік дзяржавы даў цяперашняму комплексу. «Добра, што ён тут мае тое, што не маюць іншыя. Па ўраджайнасці, па ўдоях», — адзначыў і станоўчы бок кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт даручыў прапрацаваць рашэнне па комплексе, сыходзячы яшчэ і з таго, што займаць землі сельгаспрызначэння — гэта няправільна.

«Трэба вызначыцца. Або аднаўляць і рэканструяваць, або будаваць штосьці новае. Хаосу і неразбярыхі тут шмат. Тут трэба проста навесці парадак», — падкрэсліў беларускі лідар. — Кожны кавалачак тут павінен быць апрацаваны, і да восені павінен быць наведзены ідэальны парадак. Трэба даводзіць да розуму гаспадарку. Паглядзець, што тут неабходна, што трэба», — даручыў Аляксандр Лукашэнка.

## ЧАСУ НА ПАДРЫХТОЎКУ НЕ БЫЛО ЎВОГУЛЕ

Ад'язджаючы, Прэзідэнт расказаў, што яшчэ раз з паветра азнаёміцца з сітуацыяй на палях у Мінскім, Дзяржынскім і шэрагу іншых раёнаў. У цэлым раптоўная інспекцыя сельскагаспадарчых работ у самую іх гарачую пару закране не толькі «Усход». Гэтая паездка не была запланавана ў прэзідэнцкім графіку. І такая практыка будзе прадоўжана.



Як расказаў журналістам Віктар Сулім, дырэктар прадпрыемства, аб прыездзе Прэзідэнта даведаліся толькі позна вечарам напярэдадні, падчас уборкі рапсу. «Часу на падрыхтоўку не было ўвогуле, ды і працу трэба было скончыць. Ну, і сёння працоўны дзень пачаўся крыху раней, чым звычайна», — падзяліўся ён з журналістамі. Што тычыцца вытворчага аспекту работы прадпрыемства — тут нараканняў няма, ураджаі, надоі і іншыя вынікі прыстойныя. Па гэтых паказчыках гаспадарка можа лічыцца перадавой. Але для таго, каб яна была такой, трэба вырашыць арганізацыйныя праблемы. «Практычна ўсе кірункі, якія ёсць у сельскай гаспадарцы, у нас развіваюцца. Але ёсць куды імкнуцца, каб гэта была перадавая гаспадарка. Мы будзем над гэтым працаваць», — адзначыў Віктар Сулім.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

❍ **У тэму**

## Гаспадарка невялікая, але эфектыўная

У размове з журналістамі **Юрый НАЗАРАЎ, кіраўнік спраў Прэзідэнта,** заўважыў, што прадпрыемства невялікае, а статак кароў вялікі, і гэта прымушае займацца інтэнсіфікацыяй раслінаводства. Каб атрымаць добры вынік ад жывёлагадоўлі, трэба накарміць скаціну, а для гэтага атрымаць добрыя кармы. У цэлым з такой задачай прадпрыемства спраўляецца, укладвае шмат сіл і сродкаў і атрымлівае добрыя ўраджаі.

«Гаспадарка актыўна займаецца бульбай і прадае ў асноўным насенную бульбу, ёсць некалькі бульбасховішчаў, пераабсталявалі складскія памяшканні. Але для таго, каб займацца бульбай, трэба мець добрае бульбасховішча, а гэта цягне за сабой перапрацоўку бульбы. Тут такі ў добрым сэнсе гэтага слова клубок пытанняў. Закранулі тэму меліярацыі. У гэтай гаспадаркі невялікія плошчы меліяраваныя. Але гэта той шлях, калі кожны кавалак зямлі трэба выкарыстоўваць. Прэзідэнтам пастаўлена задача — на прыкладзе такіх гаспадарак вельмі эфектыўна выкарыстоўваць кожны кавалак зямлі». — расказаў Юрый Назараў. Таксама, па яго словах, у гаспадарцы сур'ёзна заняліся лічбавізацыяй сельскагаспадарчых працэсаў, укаранілі тры праграмныя прадукты. Як адзначыў Юрый Назараў, грошай укладзена нямала, але гэта дае і эканамічны, і вытворчы эфект.

# Хто, дзе і калі павінен навесці парадак

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўвечары 23 ліпеня падпісаў распараджэнне аб ліквідацыі наступстваў небяспечных метэаралагічных з'яў. Дакумент падрыхтаваны па выніках праведзенай кіраўніком дзяржавы 19 ліпеня селектарнай нарады, на якой дэталёва абмяркоўваліся пытанні пераадолення наступстваў стыхіі, якая закранула шэраг рэгіёнаў краіны. Пра гэта паведамляе БелТА са спасылкай на прэс-службу беларускага лідара.**

Распараджэнне прынята ў мэтах ліквідацыі наступстваў стыхіі, зніжэння памераў шкоды, нанесенай навакольнаму асяроддзю, і матэрыяльнага ўрону, аднаўлення нармальных умоў жыццядзейнасці насельніцтва.

Прэзідэнт, у прыватнасці, даручыў **Міністэрству энергетыкі** забяспечыць:

- да 1 жніўня 2024 года падключэнне да электразабеспячэння ўсіх абясточаных домаўладанняў;
- да 22 жніўня 2024 года перавод часовых схем электразабеспячэння ад дызельных генератарных установак на электразабеспячэнне ад ліній электраперадачы;
- да 31 снежня 2024 года правядзенне аналізу стану электрычных сетак і падрыхтоўку прапаноў аб павышэнні надзейнасці электразабеспячэння адказных спажыўцоў і населеных пунктаў.

**Міністэрствам лясной гаспадаркі, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, адукацыі, а таксама Кіраўніцтву спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі** даручана завяршыць работу па ачыстцы даступных лясных насаджэнняў ад ветравальна-бураломных дрэў і іх частак, якія ўтварыліся з прычыны небяспечных метэаралагічных з'яў у ліпені 2024 года, шляхам правядзення:

- да 1 лістапада 2024 года — суцэльных санітарных высечак;
- да 31 снежня 2024 года — выбарачных санітарных высечак і прыборак захламленасці.

**Міністэрства прамысловасці** павінна забяспечыць:

- сумесна з ААТ «МАЗ» па заяўках Міністэрства лясной гаспадаркі, Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да 1 лістапада 2024 года выраб і пастаўку да 100 сартыментавозаў МАЗ для вывазу драўніны;
- сумесна з ААТ «Амкадор» выкананне ўсіх кантрактных абавязацельстваў перад Міністэрствам лясной гаспадаркі па пастаўках лесанарыхтоўчай тэхнікі ў раней узгодненых аб'ёмах.

Кіраўніком дзяржавы даручана **аблвыканкамам** арганізаваць прыцягненне грамадзян да правядзення работ па прыборцы захламленасці на адпаведных тэрыторыях, а таксама забяспечыць аднаўленне пашкоджаных капітальных будынкаў (збудаванняў) і іх частак (апорных канструкцый, дахаў, агароджаў і іншага).

**Брэсцкаму аблвыканкаму на тэрыторыі Брэсцкай вобласці:**

- да 1 жніўня 2024 года — у жыллёвым фондзе, на аб'ектах, якія патрабуюць першачарговага аднаўлення, прызначаных для забеспячэння і абслугоўвання вытворчасці, нарыхтоўкі, захоўвання і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі і апрацоўкі яе адходаў;
- да 15 жніўня 2024 года — на аб'ектах сацыяльнай сферы;
- да 30 жніўня 2024 года — на аб'ектах сельгаспрызначэння;

**Віцебскаму аблвыканкаму на тэрыторыі Віцебскай вобласці:**

- да 2 жніўня 2024 года — на аб'ектах сельгаспрызначэння, размешчаных на тэрыторыі Ушацкага раёна;
- да 15 жніўня 2024 года — на аб'ектах сельгаспрызначэння, размешчаных на тэрыторыі Верхнядзвінскага раёна;

**Гомельскаму аблвыканкаму на тэрыторыі Гомельскай вобласці:**

- да 1 верасня 2024 года — у жыллёвым фондзе;
- да 15 верасня 2024 года — на аб'ектах сельгаспрызначэння;
- да 21 верасня 2024 года — на аб'ектах сацыяльнай сферы;

**Гродзенскаму аблвыканкаму на тэрыторыі Гродзенскай вобласці:**

- да 23 жніўня 2024 года — у жыллёвым фондзе і на аб'ектах сацыяльнай сферы;
- да 1 верасня 2024 года — на аб'ектах сельгаспрызначэння;

**Мінскаму аблвыканкаму на тэрыторыі Мінскай вобласці:**

- да 26 ліпеня 2024 года — у жыллёвым фондзе і на аб'ектах сацыяльнай сферы;
- да 19 жніўня 2024 года — на аб'ектах сельгаспрызначэння.

**Магілёўскаму аблвыканкаму на тэрыторыі Магілёўскай вобласці:**

- да 1 жніўня 2024 года — у жыллёвым фондзе;
- да 20 жніўня 2024 года — на аб'ектах сацыяльнай сферы;
- да 1 кастрычніка 2024 года — на аб'ектах сельгаспрызначэння.

Кантроль за рэалізацыяй распараджэння Прэзідэнта ўскладзены на **Камітэт дзяржаўнага кантролю.**

На кантролі

# Дзеля агульнага каравая краіны

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар СЕРГЯЕНКА на мінулым тыдні быў назначаны ўпаўнаважаным прадстаўніком кіраўніка дзяржавы ў Віцебскай вобласці. Учора ён у названым статусе па даручэнні Прэзідэнта з рабочым візітам наведаў Докшыцкі, Глыбоцкі, Шаркаўшчынскі і Браслаўскі раёны. На парадку дня — кантроль за ходам уборачнай кампаніі ў паўночным рэгіёне.**



Фота БелТА.

Як паведаміў старшыня Докшыцкага райвыканкама Сяргей Абірала, на раніцу 24 ліпеня на Докшыччыне ўбрана больш за 20 працэнтаў ад агульнай плошчы, рапс на стадыі завяршэння. Гэтай культуры сёлета сабралі ў два разы больш, чым летась, а некаторыя гаспадаркі раёна атрымалі каля 30 цэнтнераў з гектара — высокі паказчык не толькі для рэгіёна, але і для краіны.

Да жніва падрыхтавана ўся тэхніка — 51 камбайн, у кругласутачным рэжыме працуюць дзевяць зернесушыльных комплексаў. Арганізавана гарачае харчаванне для працаўнікоў у полі, а каб сэканоміць час на пераезд тэхнікі, яна захоўваецца ноччу на полі пад кантролем адказных асоб.

Падчас візіту ў Докшыцкі раён Ігар Сергяенка наведаў адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Таргуны» і «Барсучанка», дзе азнаёміўся з умовамі працы хлебаробаў, узроўнем іх заробкаў. Дарэчы, першым тысячнікам у гэтым сезоне на адвозцы збожжа сярод маладых экіпажаў у Віцебскай вобласці стаў кіроўца ААТ «Таргуны» Аляксандр Маскалёнак, таму прадпрыемству ёсць чым ганарыцца.

Падчас агляду сельгаспрадпрыемстваў паўночнага рэгіёна, Ігар Сергяенка цікавіўся тэмпамі жніва, праблемамі, з якімі сутыкаюцца гаспадаркі, а таксама не прамінуў спытаць у працаўнікоў аб агульным настроі і планах на бягучую ўборачную кампанію.

«Асаблівая радасна, што традыцыя моладзі дапамагаць на зернесушыльных комплексах хлебаробам у гарачую пару працягваецца з году ў год. Цяпер любая дапамога — каштоўная, дзеля агульнага каравая краіны», — заключыў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

У Шаркаўшчынскім раёне Ігар Сергяенка наведаў працаўнікоў КУВСП імя Маркава, якія шчыравалі на чатырох камбайнах у аддзяленні «Рассвет». Падчас размовы з кіраўніцтвам раёна аб ходзе ўборачнай разглядаліся пытанні будаўніцтва сучаснай малочнатаварнай фермы, газіфікацыі аграгарадка Радзюкі.

На 24 ліпеня аграрыі Шаркаўшчыны ўбралі 25 працэнтаў ад запланаванага, намалацілі больш за шэсць тысяч тон зерня. Набіраюць тэмпы працаўнікі хлебнай нівы ў ААТ «Жвіранка». Старшыня Палаты прадстаўнікоў разам з вопытным камбайнерам гаспадаркі Сяргеем Курцом праехаў па полі на айчынным «Палессі», асабіста ацаніўшы ўнутраны стан тэхнікі і ўмовы працы механізатара, адзначыўшы, што нават доўгая эксплуатацыя пры беражлівым выкарыстанні і доглядзе дазваляе тэхніцы заставацца ў выдатным стане.

Падводзячы вынікі рабочай паездкі, Ігар Сергяенка нагадаў, што на селектарнай нарадзе кіраўніком дзяржавы былі пастаўлены дакладныя задачы па арганізацыі ўборачнай кампаніі. Прэзідэнт адзначыў, што сур'ёзных праблем няма і ўсё залежыць, па-першае, ад арганізацыі работы, па-другое, ад стварэння ўмоў для тых людзей, якія заняты на гэтых работах, па-трэцяе, ад дысцыпліны.

«Я ўбачыў, што на Віцебшчыне, якая, на жаль, па тэмпах адстае ад іншых рэгіёнаў нашай краіны, сёння ўборка набірае абароты. 3,5-4 працэнты за дзень фактычна ўсе раёны ўбіраюць, тэмпы ўзрастаюць», — сказаў ён.

Упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Віцебскай вобласці зрабіў выснову, што ўсе настроены на плённую, згуртаваную камандную работу.

«Па-першае, тэхніка ўся працуе. Так, ёсць паломкі, якія ўзнікаюць практычна ў кожным раёне. Яны нязначныя, устараняюцца непасрэдна на месцы, часам, можа быць, з выкарыстаннем майстэрняў, — адзначыў Ігар Сергяенка. — У майстэрнях у асноўным парадак. Вядома, шматлікія памяшканні патрабуюць рамонту, нешта ўжо састарэла, але ва ўсякім разе вырашаюцца тыя задачы, якія забяспечваюць захоўванне тэхнікі ў восеньска-зімовы перыяд. Няма нейкіх празмернасцяў, суперсучасных гаражоў. Тым не менш усё падтрымліваецца ў працоўным стане».

Немалаважная ўвага ўдзяляецца сацыяльным пытанням, адзначыў Ігар Сергяенка. Размова ідзе аб арганізацыі гарачага харчавання прама на полі. «У канцы кожнага дня — я гутарыў з камбайнерамі — кожны з іх ведае, колькі ён зарабіць за дзень, колькі ён рэальна атрымае грошай падчас уборкі. Гэта значыць, людзі таксама разумеюць: калі ты зробіш больш, больш якасна, ты больш і заробіш», — адзначыў ён.

Рабочую паездку ў Віцебскую вобласць крыху азмрочыла наведванне Глыбоцкага камбікормавага завода. У цэлым прадпрыемства працуе, забяспечвае прыём зерня, адзначыў старшыня Палаты прадстаўнікоў. «Але тэрыторыя і ўсё, што побач з гэтым прадпрыемствам, вядома, патрабуе павышанай увагі. Проста элементарна навесці парадак. Як і навесці парадак з новым цэхам па перапрацоўцы рапсу. Сучасная вытворчасць, якая фактычна на сёння прастойвае», — адзначыў ён.

Упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Віцебскай вобласці падкрэсліў, што практычна ўсе аб'екты падчас рабочай паездкі наведвалі з колаў, мяняючы напрамак руху. Маршрут не быў падрыхтаваным. Разам з тым у старшыні Палаты прадстаўнікоў склалася ўражанне нармальнай працоўнай атмасферы. Ён упэўнены, што аграрыі сваю задачу выканаюць, нягледзячы на няпростыя ўмовы.

«Якіх-небудзь сур'ёзных праблем, якія патрабавалі б вырашэння на рэспубліканскім узроўні, якія датычацца менавіта ўборкі, не называлася», — падсумаваў Ігар Сергяенка, дадаўшы, што выказваліся асобныя пытанні і пажаданні па тэме развіцця сельскай гаспадаркі, у тым ліку над якімі давядзецца працаваць.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# Першыя — найлепшыя!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Першым на Віцебшчыне камбайнерам-тысячнікам стаў Генадзь Анкудовіч з адкрытага акцыянернага таварыства «Навасёлкі-Лучай» Пастаўскага раёна. Проста ў полі павіншаваць перадавіка сельскагаспадарчай вытворчасці з першай у гэтым сезоне тысячай тон зерня прыехалі кіраўнік вобласці Аляксандр Субоцін, старшыня Пастаўскага райвыканкама Сяргей Чэпік, прафсаюзны лідар аграрыяў вобласці Тацяна Дзіканава, дырэктар ААТ «Навасёлкі-Лучай» Юрый Шымчык. З каштоўнымі падарункамі кіраўніцтва паўночнага рэгіёна выказала словы падзякі вопытнаму хлебаробу за ўклад у харчовую бяспеку краіны.

Аб тым, што камбайнер — чалавек са справай сваёй знаёмы, — гаворыць і той факт, што летась Генадзь Анкудовіч другім у вобласці намалаціў тысячу тон збожжа, а пасля першым перавысіў двухтысячны намалот. Стаць тысячнікам імкнецца кожны хлебароб, а тым, каму гэта ўдаецца, — асаблівая пашана, таму з надыходам жніва мужчына мае намер сабраць у бункер чырвонага камбайна як мага больш спелых каласоў. Генадзь пераехаў на Пастаўшчыну каля пяці гадоў таму і адразу прыйшоў у «Навасёлкі-Лучай». Летась за высокі прафесіяналізм і адданасць справе кіраўніцтва выдзеліла механізатару навейшы камбайн КЗС-2124 з дзевяціметровай жаткай. Такіх, дарэчы, у краіне пакуль няшмат, і менавіта пры дапамозе яе летась Анкудовіч змог абыйсці па намалоце імпартныя «Нью Холанды».

«Галоўнае, каб тэхніка і надвор'е не падводзілі. І, вядома, важна, наколькі ўдала саспелі палі», — дзеліцца перадавік, прымаючы шматлікія віншаванні.

Першым тысячнікам, які працуе на камбайне імпартнай вытворчасці, стаў Аляксандр Зябко з філіяла «Зара» ЗАТ «Віцебскаграпрадукт». Ён першым у Чашніцкім раёне і вобласці намалаціў тысячу тон збожжа і рапсу.

Ужо з'явіўся ў паўночным рэгіёне і другі камбайнер-тысячнік на айчыннай тэхніцы. Сёлета ў перадавікі выйшаў Дзяніс Пшонны, які шчыруе ў прадпрыемстве «Маяк Высокае» Аршанскага раёна. У гэтым годзе ў гаспадарцы пад уборку адведзена 1100 гектараў, з іх засталося менш чым 500. І тысячу тон збожжа з урадлівых аршанскіх палёў сабраў менавіта Дзяніс. Дарэчы, побач з ім на хлебнай ніве шчыруе малодшы брат Яўген, ён выйшаў у лідары ў маладзёжнай намінацыі, намалаціўшы звыш 800 тон. Павіншаваць аграрыяў у поле прыехалі старшыня райвыканкама Ігар Мароз, старшыня прафсаюза работнікаў АПК Вольга Нікіценкава, кіраўніцтва гаспадаркі.

Маладыя кадры — рухавік прагрэсу, гэта пацвярджаюць на справе камбайнеры і кіроўцы, якія з'яўляюцца цяпер удзельнікамі рэспубліканскага праекта «Моладзь — за ўраджай!». Так, першым на Віцебшчыне тысячнікам на адвозцы збожжа стаў Аляксандр Маскалёнак з ААТ «Таргуны» Докшыцкага раёна. Летась ён перавёз за жніво больш чым тры тысячы тон ураджаю. Гэты год таксама павінен быць не горшым. Малады аграрый з мясцовых, скончыў Лепельскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж і прыйшоў на работу ў «Таргуны». Тут, дарэчы, працуе кіроўцам яго бацька, а брат Андрэй — галоўным інжынерам, такая сямейная дынастыя ў адной гаспадарцы атрымалася. «Дапамога і падтрымка ў пачатку шляху вельмі важныя. Родныя мясціны даюць сілы, саграваюць душу асаблівай цеплынёй. А працаваць сумленна трэба ў любой справе, каб людзі цябе паважалі і самому было не сорамна», — разважае перадавік.

У Год якасці Віцебская абласная прафсаюзная арганізацыя работнікаў АПК заснавала імянныя прэмії-сертыфікаты, першую з іх Аляксандр Маскалёнак атрымаў з рук прафсаюзнага лідара аграрыяў вобласці.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Паветраны шар са смеццем з КНДР прызямліўся на тэрыторыі офіса прэзідэнта Паўднёвай Карэі



Адзін з паветраных шароў са смеццем, адпраўленых КНДР, прызямліўся на тэрыторыі офіса прэзідэнта Паўднёвай Карэі. Аб гэтым паведаміла інфармагенцтва «Рэнхап» са спасылкай на прэзідэнцкую службу бяспекі. «Расследаванне, праведзенае групай хімічнага, біялагічнага і радыелагічнага рэагавання, паказала, што прадметы не ўяўлялі небяспекі», — заявілі ў службе. — Мы працягваем маніторынг у супрацоўніцтве з аб'яднаным камітэтам начальнікаў штабоў узброеных сіл Паўднёвай Карэі». З канца мая КНДР запусціла больш як тры тысячы паветраных шароў са смеццем у знак пратэсту супраць паўднёвакарэйскіх улётак, якія рассылаюцца паўночнакарэйскімі перабежчыкамі і актывістамі на Поўдні.

### Tesla пачне выкарыстоўваць чалавекападобных робатаў



Амерыканская кампанія таксама плануе прыступіць да іх выпуску ў большай колькасці для іншых кампаній у 2026 годзе. Аб гэтым напісаў у сацсетцы кіраўнік аўтавытворцы Ілан Маск. Tesla працуе над такімі робатамі ўжо некалькі гадоў і разлічвае, што яны змогуць выконваць цяжкія задачы, а таксама дазволяць зменшыць дэфіцыт рабочай сілы і павысіць эфектыўнасць вытворчасці, адзначае The Wall Street Journal. Чакаецца, што робаты таксама змогуць размаўляць і будуць мець абарону ад непажаданых дзеянняў. У сакавіку Маск апублікаваў відэаролік з чалавекападобнымі робатамі Optimus, якія асцярожна перамяшчаюцца па заводзе і выконваюць простыя задачы. У красавіку ён заявіў, што Optimus змогуць працаваць на заводах ужо сёлета. Мільярдэр таксама казаў, што Tesla хоча прадаваць іх танней, чым за $20 тысяч за штуку.

### Тэмпература на планеце дасягнула новага рэкорднага паказчыка



Дзень 21 ліпеня стаў самым спякотным на Зямлі ў найноўшай гісторыі, калі сярэдняя тэмпература на планеце дасягнула новага рэкорднага паказчыка. Пра гэта заявіла служба ЕС па зьмяненнях клімату Copernicus, паведаміла інфармагенцтва «Сіньхуа». Новы тэмпературны рэкорд, зафіксаваны на адзнацы 17,09 градуса Цэльсія, што перавысіла папярэдні максімум — 17,08 градуса Цэльсія, які быў устаноўлены 6 ліпеня мінулага года. Згодна з дакладам, апублікаваным службай, гэта найвышэйшая сярэдняя тэмпература на планеце, зафіксаваная сама меней з 1940 года. Да ліпеня 2023-га папярэдні тэмпературны рэкорд быў устаноўлены 13 жніўня 2016-га і склаў 16,8 градуса. Даныя, прыведзеныя ў дакладзе, сведчаць аб тым, што за апошнія 13 месяцаў было зафіксавана 57 дзён, калі гэтая адзнака перавышалася.

# ПРЫЦЯГНЕННЕ «ШАНХАЙСКАГА ДУХУ»

## Чым уражвае ШАС?

**23 гады таму назад — у чэрвені 2001-га — у сусветна вядомым кітайскім мегаполісе была створана Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва. З цягам часу рэгіянальная платформаператварылася ў запатрабаваную глабальную пляцоўку, якая стала на чале тэктанічных геапалітычных пераўтварэнняў сусветнага маштабу. Сёлета адбылася знамянальная падзея ў гісторыі арганізацыі — яна пераўтварылася ў «дзясятку» — 4 ліпеня на саміце ў Астане членам ШАС стала Беларусь. Таксама на гэтым форуме старшынства перайшло да Кітая. Чым жа ўражвае ШАС? Каб даведацца аб гэтым на ўласныя вочы, журналісты з больш чым двух дзясяткаў краін (сярод іх — карэспандэнт «Звязды») падчас медыятуру, які арганізаваў Кітайскі Камітэт ШАС па добрасуседстве, дружбе і супрацоўніцтве (КДДС), накіраваліся ў Паднябесную.**



### Касмічныя маштабы

Сёлетняе падарожжа па Кітаі пачалося менавіта з пункту адліку, адкуль амаль чвэрць стагоддзя таму назад уласна і пайшоў ШАС, — з Шанхая. Гэта глабальны эканамічны, фінансавы, гандлёвы цэнтр, порт, які ўжо каторы год трымае сусветнае лідарства, а таксама вядучы цэнтр суднаходства і навукова-тэхнічных інавацый. Пералік, вядома, далёка не поўны. Як справядліва адзначылі ў КДДС, Шанхай у поўнай меры адлюстроўвае развіццё мадэрнізацыі ў кітайскім стылі.

Мегаполіс скіраваны на перспектыву, тут увасабляюцца ў жыццё самыя амбіцыйныя праекты. Яскравы прыклад — Шанхайскі міжнародны порт, які ўжо 14 гадоў запар утрымлівае пазіцыю сусветнага лідара. Летась аб'ём перамяшчэння грузаў склаў рэкордных 49,16 мільёна дваццаціфутавых кантэйнераў (TEU) (у 2002-м тут было апрацавана каля 400 тысяч кантэйнераў). Пры гэтым знешнегандлёвы абарот Шанхая ў мінулым годзе ўзрос да 4,2 трыльёна юаняў (каля 591,5 млрд долараў).

Порт знаходзіцца не ў межах горада і нават не на кантынентальным беразе. Гэта гіганцкае рукатворнае мегазбудаванне на базе тузіна астравоў, яно добра прыкметнае з космасу. Порт уражвае сваім маштабам: яго плошча — звыш 3,6 тысячы квадратных кіламетраў. Сучасныя кантэйнеравозы маюць асадку звыш 12 метраў, а найбуйнейшыя з іх — больш за 20 метраў. І толькі чатыры порты Кітая адносяцца да міжнародных глыбакаводных. Шанхайскі — найважнейшы з іх. Сёння падаецца недарэчным, што раней сусветныя эксперты лічылі яго «малаперспектыўным» з-за мелкаводдзя і немагчымасці паглыбіць марскую берагавую лінію. Прагарама развіцця порта Яншань была прынята на ўзроўні ўрада. Гэта кантэйнерны порт на адным востраве, які структурна ўваходзіць у порт Шанхая і злучаны з ім мастом Данхай, які адкрыты ў 2006-м і з'яўляецца адным з найдаўжэйшых у свеце.

Небывалымі тэмпамі — усяго за тры гады — кітайцы правялі меліярацыйныя і паглыбляльныя работы ў заліве. Узвялі пірсы вакол некалі ціхіх рыбацкіх астравоў Вялікі і Малы Яншань (глыбіня там дасягае 15 метраў). Глыбакаводны порт Яншань быў адкрыты ў 2005-м, з таго часу штогод пашыраецца. Цяпер гэта найбуйнейшы ў свеце цалкам аўтаматызаваны кантэйнерны тэрмінал. Выкарыстоўваецца ўнікальнае пагрузачна-разгрузачнае абсталяванне, распрацаванае і выраблене ў Кітаі. Порт быў мадэрнізаваны з дапамогай стацыянарнай сеткі пятага пакалення (5G). Напрыклад, кранам можа дыстанцыйна кіраваць з адлегласці 100 кіламетраў. У такім жа рэжыме працуе і іншае абсталяванне. Мне давялося пабачыць Яншань — гэта ўвасобленыя ў рэчаіснасць карцінкі з будучыні, калі ўся тэхніка працуе без людзей. І гэта ўлічваючы гіганцкія аб'ёмы і адпаведны трафік. Геаграфія глабальная — Яншань узаемадзейнічае з больш чым паўтысячай партоў у больш чым 200 краінах і рэгіёнах свету.



### Водным шляхам

Тут дзейнічае бяспошлінная зона. Яе галоўныя функцыі — міжнародны транзіт кантэйнераў, складаванне вызваленых ад пошлін грузаў і перапрацоўка экспартных тавараў. Праект абышоўся ў больш чым 13 мільярдаў долараў. Самым буйным інвестарам выступала дзяржава праз кансорцыум з 10 кітайскіх банкаў. Прыцягваліся і замежныя інвестыцыі. Як адзначаюць эксперты, гэта дзейсная мадэль прыватна-дзяржаўнага партнёрства, пры якім дзяржава з'яўляецца натхняльнікам, стратэгам і галоўным арганізатарам. Прыватны бізнес пераважае колькасна і мае поўную гаспадарчую самастойнасць у выкананні пастаўленых задач. У акцыянерным таварыстве Shanghai International Port Group (SIPG) у дзяржавы кантрольны пакет. У сваю чаргу, SIPG і дзяржаўная Кітайская кампанія акіянскага суднаходства (COSCO), вядучае месца ў свеце па марскіх кантэйнерных перавозках) з'яўляюцца галоўнымі акцыянерамі шматлікіх спецыялізаваных кампаній, якія маюць уласнасць і бізнес у Шанхайскім порце.

Унікальная і грандыёзная сама па сабе, мадэрнізацыя шанхайскага порта цесна звязана з іншымі, не менш фантастычнымі па амбіцыйнасці, праектамі. У прыватнасці, з перакідкай часткі сцёку рэк Хуанхэ, Янцзы, Хайхэ ў паўночныя раёны краіны праз сетку каналаў: цэнтральны, усходні і заходні. Узведзеная ў сярэднім цячэнні Янцзы (прыкладна ў тысячы кіламетрах ад Шанхая) двухкіламетровая плаціна-гідравузел «Тры цясніны» значна падняла ўзровень ракі.

Ужо цяпер баржы водазмяшчэннем да 10 тысяч тон могуць курсіраваць паміж Шанхаем і аддаленым ад яго больш чым на 2300 кіламетраў Чунцынам, самым густанаселеным горадам краіны і самым буйным унутраным (рачным) портам. Шанхайскі міжнародны порт інвеставаў значныя сродкі ў інфраструктуру ў дзевяці розных партах уздоўж Янцзы. У прыватнасці, з муніцыпальным урадам Чунцына быў падпісаны дагавор аб будаўніцтве 13 прычалаў для кантэйнеравозаў на суму звыш 340 мільёнаў долараў. Так імкліва развіваецца водная сетка Паднябеснай.

### Вадарод плюс 5G

У больш чым 700 кіламетрах на поўнач ад Шанхая знаходзіцца яшчэ адзін важны кітайскі партовы цэнтр, які мае міжнародны маштаб, — Цындаа. Тут размешчаны вытворчыя магутнасці многіх буйных кампаній і прадстаўніцтвы банкаў і многіх міжнародных фірм. Рэгіянальная эканоміка абапіраецца на маштабныя дзяржаўныя прадпрыемствы, сярод якіх — карпарацыя Haier, кампанія Hisense і шэраг іншых.

Цындаа размешчаны на ўзбярэжжы Жоўтага мора, на поўдні Шаньдунскага паўвострава. Незамярзальны порт з'яўляецца цэнтрам марскіх перавозак і міжнароднага гандлю, ён супрацоўнічае з больш чым 450 партамі ў 130 краінах. Цындаа ўваходзіць у топ-10 глабальнага рэйтынгу гаваняў. Ён мае вялікае значэнне для кітайскай эканомікі і сусветнага гандлю.



Гэты порт з'яўляецца адным з найбуйнейшых стратэгічных марскіх вузлоў у Азіі. Выгаднае геаграфічнае становішча робіць яго ключавым пунктам для міжнародных грузаперавозак і супрацоўніцтва ў сферы марской лагістыкі. Цындаа служыць варотамі для экспарту і імпарту тавараў. Порт абслугоўвае шырокі спектр галін, у тым ліку металургію, аўтамабілебудаванне, сельскую гаспадарку і нават вытворчасць электронікі. Яго інфраструктура і магутнасці дазваляюць апрацоўваць вялізныя аб'ёмы грузаў. Многія замежныя кампаніі разглядаюць Цындаа як прывабнае месца для развіцця свайго бізнесу дзякуючы яго партовай інфраструктуры і лагістычным магчымасцям. Гэта ўзмацняе інтэграцыю рэгіёна ў сусветную эканоміку і садзейнічае яго развіццю.

Аўтаматызаваны кантэйнерны тэрмінал у порце высока інтэграваны з прамысловым інтэрнэтам, інтэрнэтам рэчаў, 5G, вялікімі данымі, воблачнымі вылічэннямі, штучным інтэлектам і іншымі перадавымі тэхналогіямі. Найноўшыя тэхналогіі выкарыстоўваюцца для дасягнення інтэлектуальнага прыняцця рашэнняў і сістэматычнага кіравання кантэйнернымі аперацыямі. Гэта вядучы ў свеце і першы ў Азіі цалкам аўтаматызаваны кантэйнерны тэрмінал, а таксама першы інтэлектуальны зялёны тэрмінал «вадарод плюс 5G». Тут прымяняюцца некалькі экалагічных прамысловых тэхналогій. Адно з ноу-хау — аўтаматызаваны чыгуначны кран, які абсталяваны вадародным прывадам. Гэта дазволіла скараціць шкодныя выкіды ў атмасферу практычна да нуля. Акрамя таго, на тэрмінале праз тэхналогіі аўтаматызацыі 5G стала магчымым дыстанцыйнае кіраванне адначасова шасцю пад'ёмнымі машынамі. Хуткасць загрузкі (выгрузкі) аднаго кантэйнера — каля паўтары хвіліны.

У Цындаа паспяхова развіваецца Дэманстрацыйная зона рэгіянальнага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва Кітай—ШАС. Абапіраючыся на перавагі транспартнага вузла, які спалучае ў сабе марскія, сухапутныя, паветраныя і чыгуначныя перавозкі, тут прыкладаюцца вялікія намаганні для фарміравання бесперабойнага міжнароднага лагістычнага калідора з тым, каб стварыць выхад да мора для дзяржаў — членаў арганізацыі, якія арыентаваны на Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён. З Цындаа адкрыта 42 маршруты марскіх перавозак, арыентаваных на краіны ШАС. Партавая зона Цяньвань на тэрыторыі гарадскога порта і Цэнтр мультымадальнага транспарту Дэманстрацыйнай зоны Кітай—ШАС цесна ўзаемадзейнічаюць, што павышае лагістычную эфектыўнасць.

### Вокны магчымасцяў

У кітайскай сталіцы — свае мегапраекты. На ўсход ад Пекіна, за 30 кіламетраў ад плошчы Цяньаньмэнь, побач з тысячагадовым Вялікім каналам узводзіцца найбуйнейшы ў Азіі падземны інтэграваны транспартны вузел з трохслаёвай падземнай структурай. Пад яго адведзена звыш 60 гектараў. Плошча забудовы складае каля 1,28 мільёна квадратных метраў. Як адзначаюць спецыялісты, канцэпцыя дызайну гэтага ўнікальнага праекта наватарская, будаўнічыя тэхналогіі перадавыя, прычым большасць з іх з'яўляюцца нетрадыцыйнымі. Падчас маштабных работ былі выкарыстаны тэхналогіі вялікіх даных, воблачных вылічэнняў, інтэрнэту рэчаў.

Агульныя інвестыцыі ў рэалізацыю ацэньваюцца ў 20 мільярдаў юаняў. Чакаецца, што транспартны вузел будзе ўведзены ў эксплуатацыю ўжо налета, а сярэднесутачны пасажырапаток у абодва бакі складзе каля мільёна чалавек. Тут будзе рэалізавана інтэграцыя транспартных функцый з офіснымі, культурнымі і забаўляльнымі і створана новая мадэль «інтэграцыі вакзальнага горада».

Транспартны вузел злучыць цэнтр Пекіна з яго адміністрацыйным субцэнтрам. Да яго будуць далучаны чыгуначныя лініі, уключаючы чыгунку Пекін—Харбін, некаторыя міжгародні маршруты ў рэгіёне Пекін—Цяньцзінь—Хэбэй і некалькі ліній метрапалітэна. Будуць таксама пракладзены наземныя аўтобусныя маршруты. Тут узводзіцца буйны дзелавы раён, даходы ад якога будуць накіроўвацца на будаўніцтва і эксплуатацыю гарадскога рэйкавага транспарту.

Транспартны вузел будзе выконваць функцыю гарадскога тэрмінала. Гэта дазволіць за гадзіну без перасадак дабрацца да новых раёнаў Сюнань, а таксама Цяньцзінь Біньхай, за 35 хвілін — да міжнароднага аэрапорта Дасін і горада Таншань, за 15 хвілін — да яшчэ аднаго пекінскага аэрапорта Шоўду (да слова, другога па пасажырапатоку ў свеце).

Усе гэтыя падыходы Паднябеснай, якія прыносяць насамрэч уражальныя вынікі, даступныя для вывучэння і пераймання ў рамках Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. У ШАС развіваюць плённае ўзаемадзеянне не толькі ў сферы бяспекі, але і эканоміцы, гандлю, энергетыкі, тэхналогій. Лічбы паказальныя: летась аб'ём тавараабароту паміж краінамі арганізацыі перавысіў 650 мільярдаў долараў, што на 20 працэнтаў больш, чым у папярэднім годзе. Як адзначыў генеральны сакратар ШАС Чжан Мін, менавіта «шанхайскі дух» падсілкаваў цікавасць да арганізацыі: «Прынцып «шанхайскага духу» ўвасабляе асноўны змест новага тыпу міжнародных адносін і ўяўляе кірунак развіцця ў бок больш справядлівага, раўнапраўнага і рацыянальнага міжнароднага парадку». Па меркаванні вядомага беларускага палітолага, усходазнаўца Юрыя Шаўцова, узаемадзеянне ў фармаце ШАС, у які Беларусь прыйшла ў якасці паўнаважкага члена, «дае неабсяжныя вокны магчымасцяў. Як мы імі скарыстаемся, залежыць выключна ад нас».

**Мікалай ЛІТВІНАЎ,**
**Мінск — Шанхай — Пекін — Цындаа — Мінск,**
**фота аўтара.**

# ТОЕ, ШТО ВЫРАСЦІЛІ САМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сярэдзіна лета ў нашай краіне — актыўны перыяд нарыхтовак. Белкаапсаюз паведаміў, як праходзіць нарыхтоўчая кампанія сёлета, і агучыў закупачныя цэны на сельскагаспадарчую і дзікарослую прадукцыю.

— На сёння намі ўжо закуплена 4,5 тысячы тон бульбы, у тым ліку ў насельніцтва — 3,7 тысячы тон; 12,1 тысячы тон гародніны (у насельніцтва — 10 тысяч тон), 4 тысячы тон пладоў і ягад з улікам суніц садовых і яблыкаў позніх тэрмінаў паспявання ўраджаю мінулага года, — сказала Аксана Скіндэр.

Цяпер у насельніцтва нарыхтоўшчыкі закупляюць агуркі, таматы, чарніцы і культурныя ягады, а таксама лісічкі, чырвонагаловікі і белыя грыбы.

— З 2006 года штогод мы атрымліваем крэдытныя рэсурсы на разлікі з насельніцтвам у момант закупкі, — адзначыла прадстаўніца Белкаапсаюза. — У нас няма запазычанасці перад людзьмі за закупленую прадукцыю раслінаводства: разлічваемся ў момант яе здачы. Па стане на 19 ліпеня нарыхтоўчымі арганізацыямі асвоена для плацяжоў насельніцтву за здадзеную сельскагаспадарчую прадукцыю раслінаводства 7,5 мільёна рублёў.

Калі казаць аб сезонных відах прадукцыі, сёння ўжо закуплена 350 тон чарніц з тэмпам росту да 2023 года — 172 %, парэчкі чорнай і чырвонай — 50 тон, буякоў — 15 тон і столькі ж костачкавых, а таксама 2,5 тысячы тон таматаў і 1,4 тысячы тон агуркоў. Закуплена таксама 704 тоны суніц садовых, з якіх 190 тон ужо рэалізавана насельніцтву ў свежым выглядзе.

— Звыш 50 % прадукцыі, якая закупляецца ў насельніцтва, накіроўваецца на перапрацоўчыя прадпрыемствы, — распавяла Аксана Скіндэр. — Асартымент прадукцыі сёння пастаянна пашыраецца. У максімальна шырокім асартыменце мы сумесна з перапрацоўшчыкамі прапануем спажыўцу прадукцыю з айчыннай сыравіны.

Што датычыцца гадавых планаў, нарыхтоўшчыкі намецілі закупіць сёлета каля 12 тысяч тон бульбы, 32 тысячы тон агародніны і звыш 50 тон ягад і садавіны.

— Ужо саспеў белы наліў, у гэтым годзе чакаецца яго ранні збор, — расказала начальнік упраўлення нарыхтовак. — Як і сезон ягад, яблычны сезон пачнецца на два тыдні раней, чым у 2023-м.

Нарыхтоўшчыкі чакаюць добры ўраджай: сёлета яны плануюць закупіць не менш як 40 тысяч тон яблыкаў, з якіх больш за 40 % адправяць на перапрацоўчыя прадпрыемствы сістэмы спажыўкааперацыі. Астатні аб'ём будзе рэалізаваны ў свежым выглядзе і адпраўлены іншым перапрацоўшчыкам.



## Закупачныя цэны

Яны залежаць ад кан'юнктуры рынку, рэгіёна, сорту і якасці прадукцыі, якая закупляецца, попыту і прапановы на яе ў канкрэтнай мясцовасці, падкрэсліла спецыяліст. Але ў цэлым на сёння бульбу прымаюць па кошце ад 80 капеек да рубля; цана на агуркі — ад рубля да 1.20. У перадвыхадныя дні яна можа дасягаць 1,8 рубля, дадала Аксана Скіндэр. І заўважыла, што напачатку лета ў Столінскім раёне закупачная цана складала ўсяго 40 капеек за кілаграм агуркоў.

— Таматы ў насельніцтва мы закупляем ад 2 да 3 рублёў у залежнасці ад віду і сорту, — сказала яна. — Капусту свежую — ад 70 капеек да рубля, часнок — ад 5 да 7 рублёў за кілаграм.

Закупачная цана на лісічкі — ад 4 да 10 рублёў у залежнасці ад іх якасці і параметраў. Чорныя парэчкі прымаюць па кошце ад 90 капеек да 3,5 рубля, вішню — ад 50 капеек да 3 рублёў (за гатунковую), буякі культываваныя — ад 7 да 10 рублёў.

Арганізацыі спажыўкааперацыі, ажыццяўляючы нарыхтоўчую дзейнасць, балансуюць паміж двума сегментамі насельніцтва, падзяліласся Аксана Скіндэр. Адны (сельскія жыхары) жадаюць здаць лішкі ўраджаю і дзікаcрослую прадукцыю па максімальна высокай цане, другія (гараджане) — купіць гэтую ж прадукцыю як мага танней.

— І «баланс гарманічнасці», як мы кажам, тут вельмі важны: ён вызначае стабільнасць беларускага рынку, — рэзюмавала яна.

Адно з самых хвалюючых «здатчыкаў» сельгаспрадукцыі і дароў лесу пытанняў — кошт на чарніцы. Іх Белкаапсаюз закупляе ад 3,5 рубля да 5,5 — калі ягады чыстыя і буйныя, без раслінных прымешак.

## Да пытання аб чарніцах

Што датычыцца чарніц, іх ураджай сёлета наўрад ці можна назваць высокім.

— Па звестках Нацыянальнай акадэміі навук, ураджайнасць чарніц у лясах Беларусі з-за ўмоў надвор'я ў сярэдніх балах — гэта 3-4 балы паўсюдна па краіне, — сказала Аксана Скіндэр.

Яна дадала, што лясныя ягады — чарніцы, журавіны — з'яўляюцца экспартна арыентаванай пазіцыяй і раней былі запатрабаваны на рынку ЕС. Сёння ідзе пераарыентацыя рынкаў збыту беларускіх дзікарослых ягад, якія знаходзяць свайго пакупніка ў Расійскай Федэрацыі.

— Мы шукаем рынкі збыту на даныя віды прадукцыі. Гэта Азербайджан, Арменія, Кыргызстан, Туркменістан, а таксама Кітай — тая краіна, якая можа стаць для нас асноўным пакупніком дзікарослай прадукцыі, — падкрэсліла спікер. — Мы прыступілі да рэалізацыі чарніц на экспарт і ўжо рэалізавалі ў Расійскую Федэрацыю 40 тон ураджаю 2024 года.

У Год якасці менавіта якасным параметрам нарыхтоўшчыкі надаюць пільную ўвагу. І асабліва гэта датычыцца дзікарослай прадукцыі, сказала спецыяліст.

— Хвалюючае пытанне для многіх — адпаведнасць устаноўленым нормам утрымання радыёнуклідаў, у прыватнасці цэзію і стронцыю, у дзікарослай прадукцыі, — звярнула ўвагу яна. — У нас ёсць абсталяванне для вызначэння радыцыйнага фону і лабараторыі, якія пацвярджаюць якасць і адпаведнасць прадукцыі ўсім параметрам пры закупцы і рэалізацыі як на ўнутраным, так і на знешнім рынку.

Па гэтым пытанні ў Беларусі вельмі жорсткія патрабаванні, расказалі ў Белкаапсаюзе. Так, калі ў ЕС дапушчальны ўзровень утрымання радыёнуклідаў складае 600 бекерэляў, то ў нашай краіне гэта 160 Бк. А ў дзікарослай прадукцыі, што закупляецца, гэты параметр часта ў два разы ніжэйшы за дапушчальную велічыню, адзначыла Аксана Скіндэр. Асабліва ў прадукцыі, якая накіроўваецца на вытворчасць дзіцячага харчавання.

— Для фармацэўтычных прадпрыемстваў узровень радыёнуклідаў не павінен перавышаць 20—40 Бк, але мы працуем і з такімі прадпрыемствамі і можам прапанаваць ім экалагічна чыстую прадукцыю, — падкрэсліла яна.

## І дачнікі, і фермеры

Да гарачага сезона нарыхтоўшчыкі заўсёды рыхтуюцца загадзя: пачынаюць яшчэ ўзімку.

— Сустракаемся з сельскімі жыхарамі, старастамі вёсак, з фермерскімі гаспадаркамі. А іх звыш 200 — тых, з кім мы заключылі дагаворы на закупку прадукцыі. У большай ступені — позніх тэрмінаў паспявання для закладкі на міжсезонны перыяд і рэалізацыі на экспарт, — адзначыла яна.

У закупачнай кампаніі задзейнічана 780 прыёмна-нарыхтоўчых пунктаў, нанята каля 1000 пазаштатных нарыхтоўшчыкаў.



— Максімальна прыцягваем і аўтакрамы, — дадала спікер. — У найбольш аддаленых ад райцэнтраў населеных пунктах гэта яшчэ адзін спосаб інфармаваць насельніцтва аб магчымасці здаць лішкі сельгаспрадукцыі. Прыцягваем да гэтай работы і рынкі, якія сёння ў сістэме спажыўкааперацыі 107. Там мы даём гандлёвыя месцы фермерскім гаспадаркам і насельніцтву. Вытворцы атрымліваюць магчымасць напрамую прадставіць сваю прадукцыю пакупніку. Да нарыхтовак прыцягнута таксама каля 3,2 тысячы магазінаў, размешчаных у сельскай мясцовасці.

Спецыяліст адзначыла, што разам з сельскімі жыхарамі вялікую ўвагу нарыхтоўшчыкі ўдзяляюць дачнікам.

— Не менш важным у сезон масавых нарыхтовак выступае такі сегмент вытворцаў сельгаспрадукцыі, як дачныя таварыствы. Пра іх мы не забываемся. Гэтак жа, як у вёсцы, актыўна інфармуем людзей аб сваёй дзейнасці, арганізуем работу раз'язных нарыхтоўшчыкаў і даём магчымасць дачнікам не толькі зарабіць, але і дапамагчы гарадскім жыхарам задаволіць запатрабаванне ў свежай і перапрацаванай пладова-ягаднай прадукцыі.

Фермерскія гаспадаркі спецыяліст назвала найбольш прагрэсіўным кірункам развіцця сельскай гаспадаркі краіны. Менавіта яны першымі прапаноўваюць новыя культуры, якія раней не вырошчваліся ў Беларусі, а сёння мы сустракаем іх ужо не эксклюзіўна, у садах і агародах энтузіястаў, а масава, на гандлёвых прылаўках.

— Калі раней у продажы былі пераважна чырвоныя таматы, сёння гэта найшырэйшая лінейка. Рознічная гандлёвая сетка рэалізуе іншы раз не менш за 4-5 відаў таматаў — ад звыклых чырвоных — цяплічных і грунтавых — да ружовых, жоўтых, чорных, розных формы і памеру, таматаў чэры і г. д. Практычна цэлы год у продажы беларускі размарын. Арганізацыі спажыўкааперацыі былі першымі, хто пачаў прасоўваць новую для нас культуру — кавун. Калі складваюцца спрыяльныя ўмовы надвор'я, мы закупляем аб'ёмы ў тысячу тон кавуноў і больш, прычым сёння ўжо не толькі ў Брэсцкай вобласці, якая была ў гэтых адносінах піянерам, але і ў Мінскай, і ў Гродзенскай абласцях, і нават у Віцебскай вобласці.

Аксана Скіндэр падкрэсліла, што спажыўцу беларускі кавун спадабаўся: па смакавых якасцях ён не ўступае імпартнай прадукцыі.

Адзін з важных кірункаў работы Белкаапсаюза — стварэнне штогадовага міжсезоннага запасу, у першую чаргу так званага баршчавога набору: традыцыйнай агародніны, ужываючы якую зімой, мы прывыклі атрымліваць вітаміны. Акрамя таго, нарыхтоўшчыкі прыступілі да вытворчасці ферментаваных прадуктаў, якія падтрымліваюць імунітэт насельніцтва ў халодны перыяд.

— Маючы рэцэптуры, магутнасці і свайго пакупніка, мы вырабляем саленні, мачэнні і квашэнні, — падзялілася прадстаўнік Белкаапсаюза. — Ужо прыступілі да салення агуркоў. На чарзе — таматы і мачэнне яблыкаў.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Падпіска-2024

## ЛЕТА Ў РАДАСЦЬ СА «ЗВЯЗДОЙ»

**Як ёсць, так ёсць: яна, адзіная (са штодзённых) беларускамоўная ўжо другое стагоддзе (!) прыходзіць да сваіх чытачоў і ўжо тры дзесяцігоддзі радуе іх не толькі роднай мовай, патрэбнай інфармацыяй, сустрэчамі з цікавымі людзьмі, парадамі, гумарам, але і каштоўнымі прызамі.**

Вось і надоечы адбыўся чарговы розыгрыш.

**Мангал Forester BC-779 (+6 шампураў) выйгралі**

Кабачэўскі Васіль Дзянісавіч, г. Орша Віцебскай вобласці;

Комар Ірына Аляксандраўна, г. Кіраўск Магілёўскай вобласці;

Пятровіч Лідзія Андрэеўна, г. Брэст;

Ган Кацярына Міхайлаўна, г. Ліда Гродзенскай вобласці;

Ліпніцкі Эдуард Уладзіміравіч, а. г. Возера, Уздзенскі раён Мінскай вобласці;

Патапенка Аляксандр Міхайлавіч, а. г. Аздзеліна, Гомельскі раён Гомельскай вобласці;

Скадорва Віктар Генрыкавіч, г. Мінск.

**Суперпрыз — вугальны грыль Белбагемія, 101278 — выйграў**

Тычко Альфрэд Францавіч, в. Ідолта, Мёрскі раён Віцебскай вобласці.

Што дадаць да гэтага спісу?

Хіба шчырыя віншаванні тым, каму пашчасціла! Калі ж НЕ (на гэты раз), ведайце, што час пралятае хутка (а ўжо летам — і пагатоў!)... А значыць, не за гарамі новая падпісная кампанія, падчас якой на старым прывычным месцы (у пятнічных нумарах газеты, на першай старонцы тэлепраграм) зноў з'явяцца знаёмыя купоны. Афарміўшы падпіску, адзін з іх — згадзіцеся — зусім нескладана запоўніць і даслаць у рэдакцыю. А там...

Раптам пашчасціць?!

Як казалі нашы продкі, зрабі, што можаш, а ў астатнім даверся лёсу.

**Афіцыйна:**

**Арганізатарам рэкламнай гульні «Лета ў радасць са «Звяздой»!» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**

**Рэкламная гульня «Лета ў радасць са «Звяздой»!» праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 1 чэрвеня па 30 верасня 2024 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на трэці квартал або другое паўгоддзе 2024 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 50 падпісчыкаў. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.**

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў 8 (017) 271-81-53.

## ООО «Юридическая компания Аспект» проводит первые повторные публичные торги в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ООО «ФАНУШ»

| № п/п | Наименование лота | Количество единиц, входящих в состав лота | Начальная цена без НДС*, руб. | Шаг торгов (5 %), руб. | Задаток для участия в торгах (10 %), руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | МФУ XEROX Work Centre 5021 D 5021V | 1 | 144,00 | 7,20 | 14,40 |
| 2 | Вагончик-бытовка стационарная | 1 | 729,00 | 36,45 | 72,90 |
| 3 | Кабель силовой 3x120 мм в бухте | 1 | 2 151,00 | 107,55 | 215,10 |
| 4 | Производственная линия по переработке темных нефтепродуктов | 53 | 136 503,00 | 6 825,15 | 13 650,30 |

В состав лота № 4 входит следующее имущество:

| Наименование | Количество единиц | Стоимость без НДС, руб. |
|---|---|---|
| Битумно-эмульсионная установка «Давиал БАЗИС» (некомплектная) | 1 | 81 027,00 |
| Емкость для хранения битумной эмульсии V-20 м$^3$ | 2 | 4 887,00 |
| Емкость металлическая для дизельного топлива 60 м$^3$ | 1 | 4 617,00 |
| Емкость, цистерна 15-897, диаметр 2820 мм, длина 10000 мм, объем 60 куб. м | 1 | 4 617,00 |
| Емкость, цистерна 15-897, диаметр 2820 мм, длина 10000 мм, объем 60 куб. м | 2 | 9 243,00 |
| Емкость, цистерна 15-897, диаметр 2820 мм, длина 10000 мм, объем 60 куб. м | 2 | 9 243,00 |
| Пост отгрузки эмульсии | 2 | 3 753,00 |
| Фильтр ФМКС К/СО 250-10-20-30 (в сборе) | 4 | 252,00 |
| Цистерна железнодорожная 25 м$^3$ | 2 | 6 525,00 |
| Емкость масляная м 5 м$^3$ | 1 | 810,00 |
| Ресивер 1 м$^3$ | 1 | 1 071,00 |
| Теплоноситель (сварные трубы) 8x1 м | 6 | 693,00 |
| Лестница-мостик | 7 | 3 006,00 |
| Лестница большая с платформой | 1 | 846,00 |
| Монолитные платформы под цистерны | 8 | 2 178,00 |
| Бетонные платформы под цистерны | 12 | 3 735,00 |

Условия проведения торгов размещены на сайте ООО «Юридическая компания Аспект» – «aspekt-avs.by» в разделах «Актуальные аукционы. Лоты на реализации. Прочее оборудование» по ссылке «https://aspekt-avs.by/aykciony_info/»

** Окончательная цена лота включает НДС по ставке 20 %*

*Торги назначены на **07.08.2024 г. в 10.30** по адресу: **г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, холл (4-й этаж)**. Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – **до 05.08.2024 г.** включительно. Заявки принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30)*

| | |
|---|---|
| **Продавец** | **ООО «ФАНУШ»** |
| **Организатор торгов** | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| **Реквизиты для оплаты задатка** | **ООО «Юридическая компания Аспект», р/с № BY05TECN30120738300060000000 в ОАО «Технобанк», г. Минск, БИК TECNBY22, УНП 191366886** |

Объявление о предыдущих торгах опубликовано в газете «Звязда» за 20.06.2024 г. (стр. 11)

Получить дополнительную информацию о порядке проведения торгов можно по телефону +375 (44) 5986627 в рабочие дни с 9.00 до 17.30 в (по пятницам – до 16.30). Ознакомиться с предметом торгов возможно по месту нахождения имущества после предварительного согласования по тел. +375 (44) 5986627

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
### по продаже не завершенного строительством жилого дома и права аренды земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Гродно 27 августа 2024 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; права аренды земельного участка), руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Гродненская область, г. Гродно, ул. Ровная, 6 (У-142, микрорайон «Барановичи-9»), 440100000003005937 | 0,1004 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, готовность 36 %. Надземных этажей: 1. Наружная площадь: 140 (185) кв. м, фундамент – бетон; наружные, внутренние стены, перегородки: газосиликатный блок; двери, ворота: деревянные; терраса | 395,64 | 38 389,51 (33 522,62; 4 866,89) | 4 800 |
| 2 | Гродненская область, г. Гродно, ул. Полянная, 11 (У-97, микрорайон «Барановичи 5, 6»), 440100000003005386 | 0,0990 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, готовность 37 %. Надземных этажей: 1. Наружная площадь: 139 кв. м, общая площадь здания 110,1 кв. м. Фундамент – бетон; наружные, внутренние стены, перегородки: блоки газосиликатные | 265,44 | 36 350,68 (31 551,65; 4 799,03) | 4 700 |

Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 99 лет (с момента государственной регистрации права), целевое назначение: для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке могут отсутствовать. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения, в течение 10 рабочих дней; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды земельного участка; продолжить строительство жилого дома в соответствующий решению срок. Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Гродненского горисполкома от 12.04.2022 г. № 260.

**Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: +375 (152) 626055, 626056.**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы; гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления об участии в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык. Документы, составленные за пределами Республики Беларусь в соответствии с законодательством иностранного государства, должны быть легализованы, если иное не предусмотрено законодательством. Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

**Аукцион состоится 27 августа 2024 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

**Прием документов осуществляется по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 29 июля по 21 августа 2024 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.

Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за право аренды земельного участка; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в аренду победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**28 августа 2024 г.** **№ 7-Н/2024**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
### по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с продажей права частной собственности и право аренды на земельный участок в г. Гомеле

| № лота | Наименование объекта/ адрес земельного участка: г. Гомель | Целевое назначение/ вид вещного права | Кадастровый номер, площадь земельного участка | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку док-ции, руб. | Наличие ограничений, обременений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Красный Маяк У-271 (по генплану), ул. Престижная, 2 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность | 321089204601000141 0,0863 га | 24 600,32 | 4 674,06 | Ориентировочно 5 500,00 | Охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, легкотипного металлического сооружения, следов земляных работ |
| 2 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Красный Маяк У-359 (по генплану), ул. Красносельская, 34 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность | 340100000008002019 0,0867 га | 23 136,14 | 4 395,87 | Ориентировочно 5 500,00 | Охранная зона объектов газораспределительной системы, зона санитарной охраны водопроводных сооружений, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, следов земляных работ |
| 3 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Красный Маяк У-383 (по генплану), ул. Красный Маяк, 57 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ право аренды | 340100000008002077 0,0825 га | 6 499,79 | 1 234,96 | Ориентировочно 5 500,00 | Охранная зона объектов газораспределительной системы, зона санитарной охраны водопроводных сооружений, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, легкотипного сооружения, следов земляных работ |

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр».

2. **Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов на земельном участке в г. Гомель», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.**

3. **Аукцион состоится 28 августа 2024 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16,** при наличии не менее двух участников. Если заявление на участие подано только одним гражданином Республики Беларусь, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной **на 5 процентов.**

4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, индивидуальные предприниматели и юридические лица. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в ЦБУ № 301 ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в ЦБУ № 301 ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах).

**Перечень документов, предоставляемых участником:**

4.1. заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; гражданам Республики Беларусь – копия паспорта, представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

4.2. представители или уполномоченные должностные лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов.

5. Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон, в процессе подготовки и проведения аукциона.

6. **Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

6.1. В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников).

6.2. После совершения победителем аукциона действий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, и представления организатору аукциона и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона местный исполнительный комитет заключает договор аренды земельного участка (в случае предоставления земельного участка в аренду).

7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 29 июля по 26 августа 2024 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14.**

**Контактный телефон +375 232 30-12-46.**

**Информация размещена на сайте: www.geodezcentr.by, gomeloblzem.by, gki.gov.by, газета «Звязда», «Гомельские ведомости»**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

25 ЛІПЕНЯ 2024 г.
ЧАЦВЕР
№ 13 (15981)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Юлія СІНКЕВІЧ:

# «СЦЭНА ДЛЯ МЯНЕ — ДРУГІ ДОМ»



Прыгажосць і розум, зграбнасць і талент, працавітасць і адданасць, шчырасць і рашучасць... Пералік якасцяў, уласцівых беларускай дзяўчыне, можна працягваць бясконца. Аднак, нягледзячы на гэта, кожная з нас яркая і індывідуальная асоба, са сваімі поглядамі на жыццё, прынцыпамі і меркаваннямі. І калі жаданне стаць сапраўднай каралевай, якая змяняе свет да лепшага, памнажае вечнае і светлае ёсць у многіх студэнтак, то званне першай універсітэцкай прыгажуні можа атрымаць толькі адна. Сёлета «Каралевай студэнцтва Беларусі 2024» стала Юлія Сінкевіч, студэнтка Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Аднак каб заваяваць галоўную ўзнагароду, трэба было прайсці ўніверсітэцкі і абласны этапы, а напярэдадні студэнтку філалагічнага факультэта чакае міжнародны конкурс. Карэспандэнт «Чырвонкі. Чырвонай змены» распытала дзяўчыну, якім быў яе шлях да перамогі...

***— Ваш шлях да запаветнай кароны пачаўся з універсітэцкага этапу «Міс і Містар універсітэт-2024». Чым было абумоўлена рашэнне ўзяць удзел у конкурсе?***

— Прымала рашэнне сама, аднак даволі доўга. Былі думкі: а раптам не атрымаецца, не спраўлюся. Але мой унутраны голас падказваў, што не варта заўчасна здавацца і трэба ўсё ж паспрабаваць. Таму для мяне ўніверсітэцкі этап стаў першай прыступкай, першым вопытам у такіх конкурсах.

***— Вольна адчуваць сябе на сцэне не кожны можа, а прадставіць творчы і артарскі нумары, зграбна прайсціся на абцасах — адзінкі. Таму раскажыце, як пачалася ваша сумесная гісторыя са сцэнай?***

— Сцэна для мяне — другі дом. Мой шлях на ёй пачаўся з Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь харэаграфічнага ансамбля «Зорька». З самага дзяцінства я выступаю на розных мерапрыемствах і фестывалях. Я не ўяўляю сваё жыццё без сцэны, без гледача і тых эмоцый, якія атрымліваю ад кожнага выступлення. Момант, калі ты стаіш за кулісамі і ўсе думкі змешваюцца, самы хвалюючы. Выходзячы на сцэну, я адчуваю сябе на сваім месцы, авацыі і падтрымка гледача надаюць мне сілы і ўпэўненасці ў сабе.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

*Час маладых*

## Стартаваў відэапраект «DEEPлом»

Новае ток-шоу ад студэнтаў факультэта журналістыкі распрацавана і рэалізоўваецца як адукацыйны праект пры ўзаемадзеянні інфармацыйнага агенцтва «Минск-Новости», факультэта журналістыкі БДУ і Беларускага саюза журналістаў. Першы выпуск ужо даступны на You-Tube-канале агенцтва «Минск-Новости».



Мэта праекта — стварыць адкрытую платформу для камунікацыі, якая паспрыяе свабоднаму і плённаму дыялогу моладзі з прызнанымі экспертамі ў розных галінах. У кожным выпуску будуць абмяркоўвацца актуальныя пытанні шырокага спектру тэм: ад сацыяльна-палітычных праблем да гістарычных падзей, эканамічных тэндэнцый і навуковых дасягненняў. Паводле слоў дэкана факультэта журналістыкі Аляксея Бяляева, ідэя ток-шоу ўзнікла пад уражаннем ад праекта «Напрамую» з удзелам рэктара БДУ Андрэя Караля. Дэкан падкрэсліў, што назва «DEEPлом» адлюстроўвае глыбінную накіраванасць праекта, задача якога — усебакова раскрываць абраныя для дыялогу тэмы.

Прэм'ерны выпуск ток-шоу быў прысвечаны малавядомым фактам пра Мінскае падполле. Гледачы даведаліся, колькі гадоў прайшло, перш чым Мінск быў удастоены звання «Горад-герой», а таксама пазнаёміліся з асобамі, якія стаялі на чале Ваеннай рады партызанскага руху. Вядучым першага выпуску стаў Андрэй Крывашэеў — дэпутат Мінгарсавета, генеральны дырэктар агенцтва «Минск-Новости». Экспертамі выступілі: гісторык, дэкан факультэта журналістыкі БДУ Аляксей Бяляеў; старшыня беларускага таварыства «Знание», дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь Вадзім Гігін і гісторык, публіцыст, дэпутат парламента Вячаслаў Даніловіч. Гасцямі прэм'ернага выпуску былі прадстаўнік пракуратуры горада Мінска Аляксей Валынец, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Сяргей Клішэвіч і старшыня Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь Мікіта Рачылоўскі.

Здымкі ток-шоу праходзілі ў тэлевізійным павільёне БДУ. Студэнты другога і трэцяга курсаў факультэта журналістыкі ўдзельнічалі ва ўсіх этапах вытворчасці: ад напісання сцэнарыя да аператарскай работы і рэжысуры. Падчас карпатлівых пошукаў у архівах удалося знайсці ўнікальную інфармацыю і малавядомыя даныя, якія раней не былі агучаны на шырокую аўдыторыю.

Дарэчы, ужо вядзецца работа над другім выпускам. Сумеснымі намаганнямі Міністэрства інфармацыі і кіраўніцтва БДУ «DEEPлом» можа стаць пастаянным студэнцкім ток-шоу.

## У БДУІР — новыя спецыяльнасці

З кожным годам расце попыт на спецыялістаў у IT-сферы. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі ідзе ў нагу з часам. Тут сёлета абітурыентам прапанавалі тры новыя спецыяльнасці, адкрыццё набору на якія было прадыктавана арганізацыямі-заказчыкамі кадраў.

Спецыяльнасць «Электроннае машынабудаванне» (факультэт камп'ютарнага праектавання) адкрылі ў цесным узаемадзеянні з ААТ «Планар». Адукацыйны стандарт, прыкладны навучальны план і вучэбна-праграмная дакументацыя распрацоўваюцца з прыцягненнем кадравага рэсурсу дадзенай арганізацыі. Там студэнты асвояць стварэнне праграмнага забеспячэння для сістэм аўтаматычнага кіравання і структурных схем алгарытмаў кіравання тэхналагічным абсталяваннем. Яшчэ прадугледжана навучанне навыкам праектавання аўтаматызаваных тэхналагічных комплексаў і функцыянальных модуляў вырабаў электроннага машынабудавання.

Хто паступіць на спецыяльнасць «Кіберфізічныя сістэмы» факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання, набудзе веды і ўменні ў галіне лічбавага праектавання, мадэлявання і вытворчасці, інфармацыйных сістэм кіравання вытворчасцю і прадпрыемствам. Студэнтам прапануецца вывучаць робататэхніку, прамысловыя сэнсорыку і інтэрнэт рэчаў (IIoT), а таксама вялікія даныя (Big Data).

«Гэтая спецыяльнасць арыентавана на падрыхтоўку спецыялістаў новага пакалення для развіцця высокатэхналагічнай прамысловасці ў фармаце «разумных» вытворчасцяў, — тлумачаць у прэс-службе БДУІР. — Яны, у сваю чаргу, валодаюць высокай ступенню аўтаматызацыі, самаарганізацыі, здольнасцю хутка рэагаваць на індывідуальныя запыты спажыўцоў». Адкрыццё «Кіберфізічных сістэм» было падтрымана ААТ «Мінскі аўтамабільны завод», УП «ІЦТ Гарызонт» і іншымі.

Інжынерна-эканамічны факультэт БДУІР прапаноўвае абітурыентам спецыяльнасць «Лічбавы маркетынг», дзе яны змогуць вывучаць розныя IT-дысцыпліны, у тым ліку эканамічныя і маркетынгавыя. Выпускнікі авалодаюць запатрабаванымі на рынку працы кампетэнцыямі, і перад імі адкрыюцца шырокія магчымасці кар'ернага росту ў розных галінах эканомікі. З улікам узрастаючай ролі лічбавых тэхналогій прафесія «спецыяліст па лічбавым маркетынгу» — адна з найбольш перспектыўных і высокааплатных.

Новыя спецыяльнасці папулярныя сярод абітурыентаў. Па словах прадстаўнікоў прэс-службы, на спецыяльнасць «Лічбавы маркетынг» на адно месца прэтэндуе больш за тры чалавекі: «Арганізацыі-заказчыкі кадраў заявілі запатрабаванне ў 50-60 чалавек у год. У далейшым попыт на такіх спецыялістаў будзе толькі ўзрастаць».

# «СЦЭНА ДЛЯ МЯНЕ — ДРУГІ ДОМ»

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— У творчым конкурсе вы прадставілі танец. Раскажыце, як ствaралі яго? Як адрэагавалі ўдзельніцы калектыву WIAR, у якім вы з'яўляецеся кіраўніком, што будуць выступаць разам з вамі?***

— Творчы нумар — поўнасцю мая пастаноўка. Сёлета галоўным канцэптам конкурсу была тэма «Космас наш — жаночы сусвет». І мой творчы нумар ідэальна ўпісаўся ў дадзеную канцэпцыю. Я ставіла сабе асноўную задачу — паказаць, наколькі шматгранны жаночы характар. Паказаць свaім танцам жаночую энергію, жаночыя страхі, жаночыя эмоцыі. Я старалася перадаць як нашу слабасць, так і моцную волю. Для ўдзельнікаў майго калектыву стала сюрпрызам тое, што яны будуць выступаць са мной. З іх падтрымкай я адчувала сябе больш моцнай.

***— У гэтым годзе на фінале была рэкордная колькасць дэфіле, у якіх вы дэманстравалі сваю зграбнасць і артыстызм. Каб настолькі лёгка і ўпэўнена сябе адчуваць на абцасах, трэба шмат трэніравацца. Раскажаце пра этап падрыхтоўкі?***

— Рэкордная колькасць дэфіле сапраўды стала невялікім выпрабаваннем — абцасы былі 11 сантыметраў. Рэпетыцыі ў нас праходзілі штодня з раніцы да самага вечара. Не скажу, што з дэфіле ў мяне былі цяжкасці, бо з намі працавалі прафесіяналы сваёй справы, якія ў сваю чаргу даступна і зразумела тлумачылі ўсе дэталі. Таксама да рэспубліканскага этапу мяне рыхтавала Віялета Куроўская, спецыяліст аддзела культурна-масавай і забаўляльнай дзейнасці УВРМ, кіраўнік тэатра моды «Уні-АРТ». Дзякуючы ёй не дапамозе, я пераадолела ўсе цяжкасці.

***— Рэпетыцыі рэпетыцыямі, аднак патрэбен і адпачынак, каб былі сілы пасля ззяць на сцэне. Як бавілі вольны час падчас штодзённай падрыхтоўкі да конкурсу?***

— Нягледзячы на вялікую колькасць рэпетыцый, мы з дзяўчынкамі паспявалі адпачываць. Праект даў нам магчымасць наведаць кандытарскую фабрыку «Камунарка». Экскурсія па гэтым прадпрыемстве падарыла шмат пазітыўных эмоцый. Мы бачылі, як ствараюцца самыя папулярныя цукеркі, даведаліся, як шмат людзей працуюць для таго, каб наша жыццё было «салодкім». Калі я трапіла на экскурсію, адчула сябе нібы ў раі, бо вельмі люблю шакалад. Я сапраўдны ласун. Таксама мы паспелі пабываць у аквапарку «Алімпійскі». Гэта быў час адпачынку і спакою, каля я атрымлівала асалоду ад кожнага дня, праведзенага разам з камандай і іншымі ўдзельніцамі конкурсу.



***— Падтрымка — неад'емны кампанент на шляху да поспеху. Хто вас падбадзёрваў?***

— Усе этапы я праходзіла не адна, а з людзьмі, якія падтрымлівалі мяне і не давалі сумнявацца ў сваіх сілах і магчымасцях. Бывалі і пераломныя моманты: сумневы, страхі, спусташэнне, але з імі мне дапамагала спраўляцца мая сям'я. Родныя падтрымлівалі мяне дыстанцыйна, нашы вячэрнія размовы надавалі мне сіл і энергіі для здзяйснення сваіх мэт. Таксама вялікую падтрымку адчувала ад свайго ўніверсітэта і рэктара на ўсіх конкурсных этапах. Выходзячы на сцэну і бачачы нашых студэнтаў у зале, я разумела, што не адна, бо за мной стаіць вялікая Купалаўская сям'я.

***— Каб перамагчы, трэба мець жалезную волю, быць мэтанакіраваным і дастаткова амбіцыйным. Як вы выхавалі ў сабе гэтыя рысы і што яшчэ маглі б даць да пераліку неабходных якасцяў?***

— Пераможны вынік атрымліваецца тады, калі твая праца непасрэдна звязана з тым, што па-сапраўднаму табе падабаецца, надае сілы і энергію. Я люблю тое, чым займаюся. Я максімаліст і сапраўдны працаголік па жыцці. Заўсёды імкнуся развівацца і вучыцца чаму-небудзь новаму, люблю рызыкаваць і не баюся памыляцца. Добра пастаўленая мэта — залог поспеху. «Ідзі наперад і не азірайся назад» — мой дэвіз па жыцці. У такіх конкурсах таксама вельмі важныя воля і гатоўнасць да перамогі.

***— А ці ёсць у вас нейкія «рытуалы», якіх прытрымліваецеся перад важнымі мерапрыемствамі, або, можа, талісман?***

— У дзяцінстве, шпацыруючы па парку ў пошуках каштанаў для вырабаў у школу, ад матулі пачула, што яны прыносяць поспех. З тых часоў у кожнай сумачцы нашу з сабою каштаны. Веру, што яны мне дапамагаюць.

***— На сцэне вы Юлія Сінкевіч — «Каралева студэнцтвая — 2024», а якая ў жыцці звычайная Юля?***

— Юлія Сінкевіч на сцэне нічым не адрозніваецца ад Юлі ў жыцці. На сцэне пражываю свае самыя лепшыя моманты, таму і пад светам сафітаў я такая ж сапраўдная, як і ў жыцці. А жыццё ляціць, як ураган, заўсёды кудысьці бягу, вырашаю нейкія пытанні, не сяджу на месцы. Часам разумею, як мала гадзін у сутках. Але мне падабаецца мой рытм жыцця, дзякуючы яму ў мяне з'яўляюцца новыя эмоцыі і знаёмствы. Вольнага часу, шчыра кажучы, мала, але нават калі ён бывае, люблю праводзіць яго з блізкімі мне людзьмі, або хадзіць па лесе і выязджаць за горад. Таксама ў вольную хвілінку не адмаўляю сабе ў шпацыры па прыгожым горадзе Гродна, цёплых вячорках з сябрамі за кубачкам смачнай кавы.

***— Фінал прайшоў пад слоганам «Космас наш — жаночы сусвет», і ўсе тэматычныя блокі ў пэўнай ступені былі прысвечаны космасу. Калі крыху пафантазіраваць, то з якім элементам неабсяжнай касмічнай прасторы вы сябе атаясамліваеце?***

— Хутчэй за ўсё, гэта Месяц. Неверагодны прыгажосці аб'ект. Такі далёкі і невядомы, які валодае моцнай энергіяй. Мой творчы нумар звязаны менавіта з Месяцам, бо месяц-жанчына паказвае мне шлях. Менавіта гэта вучыць мяне любіць, тварыць і здзяйсняць. Часам хочацца схавацца ад усіх, пабыць сам-насам са сваімі думкамі, і якраз Месяц той самы элемент, які ўвасабляе спакой.

***— Тытул, да якога вы так старанна і доўга ішлі, дасягнуты. Таму якія цяпер перад сабой ставіце мэты?***

— На дадзены момант планую адпачынак, але моцна не расслабляюся, бо наперадзе мяне чакае міжнародны этап конкурсу. Збіраюся з думкамі, каб годна прадставіць нашу краіну.

***— А пра што марыць Каралева студэнцтва?***

— Мару наведаць усе куткі нашай неабсяжнай краіны, яшчэ глыбей пазнаёміцца з гісторыяй Беларусі і адкрыць усю прыгажосць маёй Радзімы. Яшчэ мне вельмі хацелася б пабываць у Францыі. Нядаўна ва ўніверсітэце пачала вывучаць французскую мову, на мой погляд, адну з самых рамантычных. Натхнёўшыся культурай і традыцыямі гэтай краіны, я паставіла сабе мэту вывучыць яе мову і адправіцца ў дзіўнае падарожжа.

**Анжаліка СЦЕФАНОВІЧ.**
**Фота прадастаўлена прэс-службай БРСМ.**

*З нагоды*

# Галоўнае — ведаць сваю гісторыю

## Актывісты БРСМ паўдзельнічалі ў мітынгу памяці



У ліпеньскія дні мы традыцыйна ўспамінаем трагічную і гераічную гісторыю нашай краіны, аддаём даніну памяці загінулым, ушаноўваем ветэранаў, удзельнікаў і дзяцей Вялікай Айчыннай вайны. Мы навечна абавязаны старэйшаму пакаленню, якое неймавернай цаной адстаяла свабоду і незалежнасць Радзімы, падарыла нам права на будучыню. Беларусь памятае іх подзвіг. Сведчанне таму — гарадская цырымонія ўскладання кветак і памятны мітынг, прысвечаны 80-годдзю парада партызан каля манумента «Беларусь партызанская». Удзел у святочным мерапрыемстве ўзяла моладзь пад эгідай БРСМ. Сярод ганаровых гасцей — старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцём ЦУРАН, першы намеснік старшыні Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў Дзмітрый БАНЧУК, першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» Раман БАНДАРУК.

«Сёння мы разам з актыўнымі маладымі людзьмі горада Мінска, дэпутацкім корпусам прыйшлі сюды, каб пакланіцца, аддаць даніну памяці ўсім тым, хто роўна 80 гадоў таму, у такі ж летні дзень, пасля баёў, з франтоў і лясоў прыйшлі ў беларускую сталіцу, каб адсвяткаваць знамянальны дзень вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», — адзначыў Арцём Цуран.

Адна з асноўных задач, якую ставіць перад сабой Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі — гэта выхаванне ў сучасных маладых людзей пачуцця патрыятызму як найважнейшай духоўнай і сацыяльнай каштоўнасці. Менавіта таму праводзенне розных акцый, накіраваных на ўвекавечанне памяці герояў Вялікай Айчыннай вайны, выказванне ім падзякі — добрая традыцыя. У год 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў гэта адчуваецца асабліва моцна. Актывісты БРСМ імкнуцца аказаць належную ўвагу тым, каму давялося перажыць гады вайны, наведваюць іх, дапамагаюць, абменьваюцца ўражаннямі: ветэраны распавядаюць пра вайну, маладое пакаленне — пра падзеі са свайго жыцця.

Яшчэ адным крокам да развіцця сістэмы грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі, фарміравання ў яе нацыянальнай самасвядомасці, павагі да гісторыі, культуры і традыцый беларускага народа з'яўляецца добраўпарадкаванне помнікаў і абеліскаў.

«Больш за 370 тысяч партызан аказвалі садзейнічанне Чырвонай Арміі. І моладзь Беларусі памятае гістарычныя падзеі, — заўважыў першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» Раман Бандарук. — Моладзь бывае розная, але нас аб'ядноўвае гістарычнае мінулае. У кожнага з нас ёсць дзед ці прадзед, бабуля ці прабабуля — тыя людзі, якія са зброяй у руках абаранялі сваіх дзяцей, адстойвалі сваю Радзіму. Беларусь вельмі моцна пацярпела падчас Вялікай Айчыннай вайны, і наша галоўная задача — памятаць сваю гісторыю. Мы павінны ганарыцца нашымі продкамі і дзякаваць ім за тое, што сёння жывём пад мірным небам».

Раман Бандарук таксама паведаміў аб тым, што зараз маладыя людзі прымаюць актыўны ўдзел у навядзенні парадку на тэрыторыі воінскіх пахаванняў. «За намі замацавана даволі шмат такіх месцаў, — распавёў ён. — БРСМ цесна супрацоўнічае з Мінскай гарадской арганізацыяй ветэранаў. Мы нярэдка праводзім сумесныя грамадзянска-патрыятычныя і культурна-забаўляльныя мерапрыемствы. Маладыя людзі прыходзяць да ветэранаў і дапамагаюць у прыборцы тэрыторый. Самае галоўнае — мы маем жывыя зносіны, гатовыя выслухаць і ўдзяляць належную ўвагу нашым ветэранам».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота аўтара.**

*Карысная справа*

# СМАРТ-МАЯЧОК, ТЫК-ТОК РЭПЕТЫТАР, ФІДЖЫТАЛ-ПАДРУЧНІКІ

## У Гродне падведзены вынікі адзінага ў Беларусі конкурсу бізнес-праектаў сярод моладзі

Сёлета на конкурс паступіла 75 заявак, што ў два разы больш, чым летась. Журы выбрала 11 фіналістаў. Паміж імі і адбылася барацьба за перамогу падчас адкрытай прэзентацыі з удзелам бацькоў, груп падтрымкі, прадстаўнікоў бізнесу. Тройка пераможцаў атрымала дыпломы і грашовыя прэміі. Многія намінанты былі адзначаны падарункамі бізнес-супольнасці.



### Знайсці перспектыву

Конкурс — чарговая спроба звярнуць увагу моладзі на новыя цікавыя кірункі дзейнасці, даць ёй магчымасць самастойна выбіраць тыя віды, якія яна лічыць перспектыўнымі. Па словах **намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталя НЯВЕРЫ,** у конкурсную камісію паступіла шмат цікавых ідэй і прапаноў. Усе праекты маюць пад сабой грунтоўную эканамічную базу, улічаны не толькі эканамічны эфект, але і рызыкі. Удзельнікі падлічылі і кошт інвестпраектаў.

Як вядома, бізнес не спрацуе, калі ў ім няма патрэбы, зазначыў Віталь Нявера. Паставіўшы мэту зарабіць грошы, многія маюць намер вырашаць і сацыяльныя пытанні грамадства. Гэта і экалагічнасць, і другое жыццё адходаў, і сацыяльныя аспекты. Так моладзь уключаецца ў развіццё краіны, забеспячэнне яе будучыні. Немалаважным фактарам, па словах Віталя Няверы, з'яўляецца і падтрымка бацькоў, многія з якіх прыйшлі на ўрачыстасць. Добра, што яны не стаяць убаку ад інтарэсаў і захапленняў сваіх дзяцей, а імкнуцца іх падтрымаць. Таму магчымасць трапіць у фінал — гэта таксама і перамога бацькоў — свайго роду дывідэнты ад іх увагі, а пры неабходнасці і інвестыцый.

Некаторыя праекты напачатку здаюцца не вельмі істотнымі. Як, напрыклад, водарастваральная бірка для адзення. Які ў ёй сэнс? Але студэнтка інжынернага факультэта ГрДУ імя Я. Купалы Анастасія Наско даказала, што гэта патрэбна. Яна расказала, што яе маці неадназова скардзілася на алергію і раздражненне скуры ад бірак на адзенні. Аказалася, такая рэакцыя — даволі распаўсюджаная з'ява. Вялікая колькасць людзей пакутуюць ад таго, што біркі труць скуру. Таму аўтар праекта прапануе вырабляць біркі з водарастваральнай тканіны, якія пры мыцці знікаюць. Такая тканіна існуе і, як правіла, выкарыстоўваецца для нанясення ўзораў пры вышыўцы, але яе можна ўкараніць і ў якасці бірак пры пашыве адзення, упэўнена Анастасія.

На дапамогу хворым гатовы прыйсці студэнт факультэта матэматыкі і інфарматыкі ГрДУ Нікіта Пясняк, які прапануе пальчатку для рэабілітацыі рук пасля інсульту альбо траўм. Пальчатка, па яго словах, дапамагае ў гульнявой форме аднавіць работу патрэбных зон. Для больш поўнага аздараўлення выкарыстоўваецца электрастымуляцыя па прынцыпе фізіятэрапіі, але ў гульнявой форме, пры гэтым бачна, як ідзе працэс. Хлопец лічыць, што вельмі важна звяртаць увагу на рэабілітацыю людзей. Цяпер справа за тым, каб аддаць на іспыты яго прадукт, прайсці тэсціраванне, і, пры неабходнасці, удасканаліць яго.

З прафілактыкай і рэабілітацыяй звязаны яшчэ адзін праект-фіналіст, які прадставіў вучань 8 класа Гродзенскай гарадской гімназіі № 10 Яраслаў Глуткін. Яго праект «Лёгкі крок» скіраваны на камфортную хадзьбу. Хлопцам была распрацавана вусцілка з трохслаёвага трыкатажнага палатна, дзе пласты мацуюцца спецыяльнай ніткай. У ёй ёсць і дадатковы антымікробны пласт, а для дзіцячых вусцілак — фотадрук з малюнкамі. Такія вусцілкі зручныя для доўгай хадзьбы як звычайным людзям, так і спартсменам. Гэту тэму школьнік вывучаў разам з бацькам, была знойдзена інфармацыя аб тым, што слова «вусцілка» вельмі часта сустракаецца ў запытах пошукавай сістэмы. І хаця артапедычныя мадэлі выпускаюца многімі вытворцамі, у сваіх ён знаходзіць шэраг тэхнічных, эканамічных і сацыяльных пераваг. Кошт інвестпраекта — 20 тысяч рублёў. Ідэя ў якасці эксперымента знайшла прыхільнікаў і рыхтуецца да запуску.



### Паслугі для ўсіх

Не засталіся без увагі канкурсантаў і праблемы братоў нашых меншых. Студэнт 2 курса Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта Нікіта Іванашка прапануе стварыць спецыяльную ўстанову, якая аказвае хуткую дапамогу хатнім жывёлам у экстраных выпадках. Служба павінна выязджаць і да параненых жывёл на вуліцы, аб чым паведамяць неабыякавыя грамадзяне. Паслуга можа аказвацца і тым жывёлам, якія знаходзяцца ў прытулках. Служба будзе аказваць як экстраную дапамогу з выездам на месца, так і кансультацыі па тэлефоне. Кошт інвестпраекта — каля 140 тысяч рублёў. Цана за выезд — ад 20 рублёў. Прагназуецца, што ў месяц клініка зможа абслужыць да 600 кліентаў. Акупнасць праекта, па словах Нікіты, павінна скласці 1-2 гады. Ён кажа, што такая служба паспрыяе выхаванню гуманнага стаўлення да жывёл, а яшчэ прыняе палёгку іх гаспадарам.

Экалагічную тэму развіваць канкурсанты бяруцца ў розных кірунках. Напрыклад, студэнты Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта Аляксандра Пыжэўская і Данііл Лявіцкі нацэлены на стварэнне эка фрэш-маркета пад адкрытым небам. Вось як гэта павінна быць: на ўчастку вырошчваецца экалагічна чыстая садавіна і гароднiна. Сюды прыходзяць людзі і самі збіраюць сабе ўраджай. Такія формы існуюць у розных краінах, часткова збор ураджаю «для сябе» практыкуюць і ў Беларусі. Студэнты хочуць пайсці далей і апрацаваць участак плошчай 1,5 гектара менавіта для арганічнага земляробства. Першапачатковыя інвестыцыі ў праект складуць амаль 60 тысяч рублёў. Расходы ў месяц да 25 тысяч рублёў. Чысты прыбытак абяцае быць і павінен скласці 5 тысяч рублёў. Улічылі і рызыкі, якіх нямала. У студэнтаў ёсць на іх адказ. Напрыклад, дыверсіфікацыя пастаўшчыкоў і прадукцыі, якаснае кіраванне, адаптацыя стратэгіі. Праект не такі ўжо фантастычны насамрэч.

Прыйшлася даспадобы членам журы ідэя смарт-маячка вучня 9 класа СШ № 1 горада Ашмяны Ільі Вайцяхоўскага. Ён прапануе прыладу для бяспечнасці веласіпедыстаў у цёмную пару сутак. Як правіла, менавіта ў гэты час часцей здараюцца аварыі. Згодна з правіламі дарожнага руху, на роварах з абодвух бакоў павінны быць уключаны ліхтары — белага і чырвонага колеру. Часам гэтыя ліхтары не бачны, напрыклад, пры паваротах. Ілья прапануе свой варыянт бяспекі. Ён лічыць, што дапаможа індывідуальны смарт-маячок. Прылада, якую прапануе Ілья, працуе ў некалькіх рэжымах, і яе добра бачна. Ен падлічыў, што сабекошт смарт-маячка складзе 21 рубель, рыначны кошт — 45-50 рублёў. У ходзе падрыхтоўкі праекта такі экзэмпляр быў зроблены. Дарэчы, яго можна выкарыстоўваць і на іншых транспартных сродках, напрыклад, самакатах, мотацыклах.

### Спрыяльнае асяроддзе

Многім спадабаўся рэальны праект «Тык-Ток рэпетытар па беларускай мове» вучаніцы 10 класа гімназіі № 6 горада Гродна Дыяны Чамярыс. Праект на конкурсе «Медыя-сфера» ўзнагароджаны як найлепшы акаунт у сацыяльнай сетцы. Наўрад ці хто стане аспрэчваць папулярнасць дадзенай платформы, асабліва ў маладзёжным асяроддзі. Дыяна прапанавала сваю версію вывучэння беларускай мовы. Яе відэаролікі з анімацыяй прадстаўляюць гледачам пытанні з варыянтамі адказу. Як аказалася, самымі любімымі ролікамі сталі пераклады слоў і словазлучэнняў з рускай мовы на беларускую. Такія ролікі набралі больш за 75 тысяч праглядаў. А ўсяго Дыяна правяла больш за 400 урокаў. Яна лічыць, што такога кшталту рэпетытар цікавы ўсім катэгорыям — і школьнікам, і дарослым, хто хоча павысіць свой моўны запас. Далейшае развіццё праекта дзяўчына бачыць у пашырэнні дзейнасці. Напрыклад, можна праз платформу даваць заданні цэнтралізаванага экзамену. А на ютуб-канале будзе змяшчацца разборка найбольш складаных пытанняў. Дыяна сцвярджае, што аналагічных праектаў па падрыхтоўцы да экзамену па беларускай мове пакуль няма.

У ліку праектаў — фіджытал-падручнікі, свайго роду гібрыдныя дапаможнікі з ілюстрацыямі з іх лічбавай версіяй. Інавацыя заключаецца ў спалучэнні новых тэхналогій з традыцыйнымі метадамі навучання. Аўтар праекта — студэнтка ГрДУ Елізавета Мельнікові̌ч.

Цікавасць выклікаў і парк кветак, які прэзентавала студэнтка Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта Гражына Орда. Яна прапануе не толькі знаёміць наведвальнікаў з рознымі раслінамі, але і даваць рэкамендацыі па іх вырошчванні. Там жа мяркуецца стварыць кабінет фларыстыкі, а таксама скласці адукацыйныя праграмы, арганізаваць майстар-класы, зоны адпачынку і кафэ з фітачаямі. Выдаткі на рэалізацыю праекта складуць каля 30 тысяч рублёў. Прасоўваць праект аўтар плануе на інтэрнэт-платформах.

Па выніках конкурсу пераможцам стаў праект «Смарт-маячок» з прызавым фондам у 900 рублёў. Другое месца і 600 рублёў прысуджана аўтару праекта артапедычных вусцілак. Трэці прыз у 300 рублёў дастаўся Тык-Ток-рэпетытару.

Членамі журы адзначалася, што цікавасць да конкурсу з кожным годам расце. Ёсць праекты, якія скіраваны на вырашэнне праблем у рэгіёнах, што вельмі важна. Мясцовыя органы ўлады даюць магчымасць раскрыць патэнцыял моладзі. Гэтаму садзейнічае і спрыяльнае бізнес-асяроддзе рэгіёна. Як зазначыў член журы, старшыня Гродзенскай абласной асацыяцыі прадпрымальніцтва Ігар Чарнякоў, менавіта Гродна другі год запар па выніках рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва прызнаны лепшым горадам для развіцця бізнесу. І Гродзенская вобласць у ліку лідараў. А падобнага конкурсу сярод моладзі больш няма нідзе ў Беларусі.

Што датычыцца развіцця прадпрымальніцтва, то ў Беларусі больш за 360 суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу. Па ацэнках спецыялістаў, лічба можа вырасці ўтрая. А значыць, грамадства чакае выбуховы рост суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Падобныя конкурсы, на думку Ігара Чарнякова, якраз і дапамагаюць забяспечваць гэты рост, генерыраваць бізнес-ідэі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

*Узаемадзеянне*

# ЖЫЦЦЁ «STUDЭЙШЫХ»

Студэнцтва — яркі і насычаны час для моладзі. Новы горад, знаёмствы, мноства праектаў і конкурсаў, паездак. Як такія моманты захаваць? Ці толькі фотаздымкамі ў сацыяльных сетках? А ўявіце, калі стварыць карпаратыўнае выданне на факультэце, якое зберажэ ўсе вашы ўспаміны на гады? Плюс паспрыяе наладжванню камунікацыі паміж студэнтамі розных спецыяльнасцяў, павысіць узровень іх прафесійных кампетэнцый праз вырашэнне рэальных задач. Факультэт гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ імя Янкі Купалы вырашыў не ўяўляць, а рабіць. Па ініцыятыве нашага Студэнцкага Савета з'явіўся карпаратыўны часопіс «STUDэйшыя». Давайце паглядзім, як адлюстроўваецца жыццё факультэта на яго старонках.

## З чаго ўсё пачынаецца?

Ісціна нараджаецца ў спрэчцы, а наш часопіс — у аўдыторыі на Кастрычніцкай, 5, у Гродне, на трэцім паверсе. Там калектыўна прыдумвалася і назва. Падчас адной з сустрэч прыйшла ідэя звярнуцца да радкоў класіка, чыё імя носіць наш універсітэт: «Хто ты, гэткі? Свой, тутэйшы». Але проста ўзяць і пакінуць «тутэйшых» без змен было даволі банальна, таму пачалі «гуляць» са словам. Часопіс робіцца студэнтамі для студэнтаў свайго факультэта, таму чаму б не абыграць гэта ў назве? Так і з'явіўся варыянт «STUDэйшыя» — выданне ад студэнтаў для «сваіх».

Штомесяц у згаданай аўдыторыі збіраюцца прадстаўнікі ўсіх шасці кафедр нашага факультэта і расказваюць, што ў іх адбылося за пэўны перыяд. А журналісты рэдакцыі актыўна запісваюць усё і адразу бяруць кантакты студэнтаў і выкладчыкаў для напісання будучых матэрыялаў.

Пасля застаюцца толькі супрацоўнікі рэдакцыі і пачынаюць больш дэтальна абмяркоўваць будучы нумар. Адразу тэксты размяркоўваюцца і па рубрыках: «STUDсавет», «Праекты», «Кіношны вечар», «Паэты ФГКіТу», «Гараскоп», «Што павінен кожны...». Складаючы план выпуску, як галоўны рэдактар я камбіную забаўляльны кантэнт з пазнавальным і інфармацыйным, каб студэнтам было карысна і цікава чытаць пра жыццё сваёй alma-mater.

## Мы пісалі, мы пісалі!

Змест вызначаны — рыхтуем тэксты! Выкладчыкі і студэнты з задавальненнем даюць інтэрв'ю, дзеляцца ўспамінамі, расказваюць, як рыхтаваліся да конкурсу альбо паездкі, дасылаюць фотаздымкі. Так, акрамя інфармацыі, журналісты набываюць і новыя карысныя знаёмствы, а студэнты ўзаемадзейнічаюць паміж сабой.

Часам у нас узнікаюць пытанні: як лепш асвятліць тую ці іншую тэму, да чаго варта звярнуцца ў новым нумары, на чым зрабіць




акцэнт... У такіх выпадках мы можам прыйсці за карыснымі парадамі да выкладчыкаў кафедры журналістыкі — Ірыны Герасімчык і Кацярыны Касцюшка, якія заўсёды падзеляцца сваім вопытам і крэатыўнымі ідэямі.

Дызайн, напэўна, адна з самых прыемных, аднак і ў той жа час складаных частак стварэння часопіса. Каб прыйсці да першапачатковага варыянту — чорна-белыя фотаздымкі з каляровымі акцэнтамі, трэба было прагледзець не адзін дзясятак моладзевых і студэнцкіх выданняў, прааналізаваць іх, і метадам спроб і памылак знайсці свой стыль. Працэс не самы лёгкі, аднак у Сафіі Яновіч, адной з нашых вярстальшчыц, атрымалася стварыць той самы крэатыўны і маладзёжны варыянт. І мы не спыніліся ў пошуках ідэальнага афармлення, але нязменным засталося наша жаданне ствараць маладзёжны і стылёвы прадукт. Мы працягваем эксперыментаваць: прапускаем фотаздымкі праз нейрасеткі, накладваем дадатковы фон, камбінуем розныя шрыфты... Даём волю фантазіі нашай другой вярстальшчыцы — Ганне Вашкевіч.

Таксама задача вярстальшчыкаў — задаць пэўны настрой ужо з першых старонак. Апошнія два нумары ў гэтым ім дапамагае наш ілюстратар Сафія Аўсянік. Вокладку першага нумара, прымеркаванага да 10-годдзя факультэта, упрыгожвалі сваімі ўсмешкамі першакурснікі. У снежаньскім нумары над канспектамі стомлены, але не зломлены студэнт трымае ў руках залікоўку. Сесія сесіяй, але святы па раскладзе, таму навагодні капялюшык і гірлянда таксама прысутнічаюць. Затое ў чэрвені ўжо можна рыхтавацца з аднагрупнікамі да экзаменаў на свежым паветры...

## Не забудзьце націснуць падабайку!

Пагартаць старонкі друкаванага часопіса — прыемна! Паглядзець свежы нумар на сайце факультэта — зручна! Аднак атрымліваць анонсы новых матэрыялаў, глядзець дапаўненне да ранейшых і атрымліваць зваротную сувязь ад стваральнікаў — яшчэ лепш. Мы актыўна вядзем сваю старонку ў Instagram — stud_journal, каб заахвоціць больш студэнтаў прачытаць свежы нумар. У рэдакцыі ёсць адказныя за сацыяльныя сеткі — Карына Богдан і Дар'я Бакшук. Таму, калі гатова напаўненне для новага нумара, дзяўчаты рыхтуюць свой план публікацый. А як трэба змяніць 10 шрыфтоў і некалькі разоў перавыбраць адценне блакітнага на рамцы, каб пост выглядаў больш гарманічна, зверстаць некалькі старонак-картак у выглядзе часопіса, каб прасунуць матэрыял, ці сабраць за 10 хвілін каманду для здымак reels-анонса, або засвоіць майстэрства мастака, рэжысёра і акцёра за хвіліны, то дзяўчаты ўсё зробяць.

І нарэшце самы трапяткі момант, які не губляе сваёй кранальнасці — выхад друкаванай версіі часопіса. Трымаючы яго ў руках, разумееш, якую вялікую працу мы зрабілі з камандай: планаванне, напісанне тэкстаў і іх рэдактура, вёрстка, напаўненне сацыяльных сетак. І гэта калі не згадваць тэхнічныя моманты: дамовіцца з тыпаграфіяй, часам крыху змяніць макет, забраць ужо надрукаваны выпуск... Нават пасля гэтага няма і хвілінкі на адпачынак. Трэба зноў сустракацца і планаваць новы нумар. Аналізуючы ўвесь працэс, здзіўляешся, колькі людзей задзейнічаны ў яго стварэнні, і разам з тым разумееш, што робіш нешта правільнае і карыснае.

**Анжаліка СЦЕФАНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

*Свой выбар*

# Усе ўмовы для эфектыўнай вучобы



Фота з архіва героя.

У нашай краіне шмат увагі надаецца моладзі, яе рознабаковаму развіццю і рэалізацыі, створаных ёю інавацыйных праектаў. Адным з месцаў, дзе прафесіяналы дапамагаюць падлеткам дасягнуць мэт і раскрыць талент, з'яўляецца Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк. Ён быў створаны ў 2021 годзе і ўжо пабачыў у сваіх сценах шмат таленавітых, ініцыятыўных маладых людзей, гатовых вучыцца і працаваць дзеля сваёй будучыні і дзяржавы. Сярод яго наведвальнікаў можна вылучыць вучня «Гімназіі № 3 г. Бабруйска імя мітрапаліта Філарэта (Вахрамеева)» Багдана КАНАПЛЁВА.

— Маё кола інтарэсаў даволі шырокае — ад беларускай мовы да тэхналогій, камп'ютараў і робатаў. Цікавасць да робататэхнікі і інжынерыі з'явілася ў мяне даўно. Але вырашальную ролю адыграла адкрыццё STEM-цэнтра на базе маёй гімназіі. Там я з іншымі вучнямі ўдзельнічаў у распрацоўцы розных праектаў, якія пасля рэалізоўваліся як у сценах гімназіі, так і на гарадскім узроўні. Зараз маё захапленне дапамагае мне ў раскрыцці гуманітарнага патэнцыялу.

***— Багдан, я ведаю, што ў вас ёсць выдатныя распрацоўкі і праекты па робататэхніцы. Раскажыце пра іх.***

